

КАЛІ ЎКЛЮЧАЦЬ АЦЯПЛЕННЕ 3

ЯК ВЫХАВАЦЬ НЕПАСЕДУ «Сямейная газета»



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ВЕРАСНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 186 (28802)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Валерый ІВАНОЎ, старшыня праўлення Белкаапсаюза:**

*«Белкаапсаюз сёлета нарыхтаваў больш як 50 тысяч тон яблыкаў. Што датычыцца цэн на прадукцыю, то яны не ніжэйшыя за цэны мінулых гадоў, а ў некаторых выпадках і вышэйшыя. Раннія яблыкі закупляліся па Br0,04 за кг, затым цэны павялічыліся да Br0,06-0,08. Невысокі кошт звязаны з нізкім выхадам карыснага прадукту: з 10 кг пладоў атрымліваецца 1 л соку. Рэнтабельнасць не перавышае 2-3 %. Кіраўнік дзяржавы ставіць задачу, каб у гандлёвай сетцы максімальна быў прадстаўлены беларускі яблык. Нам трэба развіваць прамысловае садоўніцтва, асабістыя прысядзібныя гаспадаркі, прапаноўваць добрыя сарты, каб яблыкі мелі таварны выгляд, доўга захоўваліся. Частка ўраджаю ўжо адпраўлена перапрацоўчым прадпрыемствам, на экспарт, частка рэалізуецца праз уласную гандлёвую сетку».*

# Стракатае майстэрства



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Народны майстар Ніна ТЫСЕВІЧ *(на фота справа)* жыве ў вёсцы Аброва Івацэвіцкага раёна. Яе тканыя вырабы, вышытыя ручнікі і карціны, выбітыя дываны ведаюць не толькі на яе малой радзіме. Ніна Мікалаеўна — удзельніца самых прэстыжных абласных і рэспубліканскіх выставак народнага мастацтва, кірмашоў, фестываляў. У маладосці яна працавала на паляводстве, больш за дваццаць гадоў даіла калгасных кароў, але ў вольны час заўсёды займалася сваёй любімай справай. Як і раней, да яе часта наведваецца суседка і найлепшая сяброўка Вольга КАЛТУНЕВІЧ. Ей першай паказвае свае рукадзельныя творы аброўская майстрыха.

**КОРАТКА**

• У Беларусі пражываюць 396 чалавек, якія старэйшыя за 100 гадоў, — 41 мужчына і 355 жанчын.

• **У нашай краіне зарэгістравана чатырохвалентная вакцына ад грыпу. На цяперашні момант яна даступная ў платных цэнтрах.**



• Дзіцячая смяротнасць на дарогах у Беларусі за 10 гадоў скарацілася ў тры разы.

• **Да Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» далучаецца новая пляцоўка — Мінскі планетарый рыхтуе для гледачоў конкурс паўнакупальных фільмаў.**

■ Актуальнае інтэрв'ю

**Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Мінаблвыканкама:**

## «ЛЁГКАГА ХЛЕБА НЕ БЫВАЕ»



**Мінскі абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла «Дажынкі-2018» пройдзе ў Мядзеле 29 верасня. Дажынкі — гэта своеасаблівы вянец пэўнага этапу працы хлебаробаў. Падчас свята падвядуць вынікі жніва, назавуць і ўзнагародзяць найлепшых з найлепшых, хто ўнёс значны ўклад у агульны каравай. Шлях да сёлетняга ўраджаю быў нялёгкі. Складаныя ўмовы надвор'я вясной і летам значна паўплывалі на ўраджайнасць збожжавых культур. Мінская вобласць намалаціла 1,3 млн тон збожжа, гэта 70 % да мінулагодняга ўзроўню. Сярэдняя ўраджайнасць — 28 цэнтнераў з гектара, што на 9,8 цэнтнера менш, чым летась. Разам з тым з улікам кукурузы, мяркуецца, валавы збор зерня павялічыцца на 300 тысяч тон. Аб выніках жніва і не толькі — гутарка са старшынёй Мінаблвыканкама Анатолем ІСАЧАНКАМ.**

***— Анатоль Міхайлавіч, на ваш погляд, погляд кіраўніка аднаго з самых вялікіх і значных рэгіёнаў краіны, як прайшло сёлетняе жніва?***

— Мяркую, уборачная кампанія прайшла арганізавана. Усё, што можна было зрабіць, людзьмі зроблена. І тут неабходна выказаць вялікую ўдзячнасць усім хлебаробам: камбайнерам, вадзіцелям, механізатарам, тым, хто быў заняты на адвозцы, сушцы зерня, хто гатаваў абеды, а таксама жонкам, дочкам, маці, якія падчас жніва ўзялі хатнія справы на сябе. Іх мужы, бацькі, сыны рана ўставалі, каб своечасова выйсці ў поле. Зразумела, што ў сям'і нехта павінен быў выконваць абавязкі па гаспадарцы.

СТАР. 2

■ 50+: жыць цікава!

## «Будзем у «Аднакласніках» бачыць, як Раіса дадала новае фота»...

### Як пенсіянеры «запальвалі» на фестывалі «Крэатыўны ўзрост»



Фота Уладзіміра ПАЎЛАВА.

**81-гадовая Галіна САЗОНКІНА з палкамі для скандынаўскай хады.**

**«Дзяўчаты, 1 кастрычніка, да Дня пажылых людзей, набіраем танцавальны гурток!» — раздаецца зычны голас дзесьці справа ад мяне, і адна з "дзяўчат" 60+ тут жа рэагуе: «Для мяне танцы — гэта ўсё! Я буду хадзіць абавязкова!» Астатнія з ухвалай смяюцца...**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

18186>

# «ЛЁГКАГА ХЛЕБА НЕ БЫВАЕ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Адзначу работу супрацоўнікаў праваахоўных органаў, што дапамагалі на жніве: нехта непасрэдна за штурвалам камбайна, хтосьці па захаванні ўраджаю, дысцыпліны. Вялікі дзякуй шэфам горада Мінска, якія аказалі істотную падтрымку. Словам, былі задзейнічаны ўсе рэзервы, каб без страт і ў тэрміны ўбраць ураджай. І, думаю, нам гэта ўдалося.

***— З якімі праблемамі сутыкнуліся хлебаробы Міншчыны і якія ўрокі вынеслі? Магчыма, яны падштурхнулі да пошуку новых падыходаў?***

— Прынцыпова вялікіх праблем, трагедыі, што мы не даатрымалі па валавым зборы збожжа і ўраджайнасці я абсалютна не бачу. Але, магчыма, гэта навучыць нас працаваць нейкім чынам больш эканомна са збожжам. Апошнім часам у большай ступені мы практыкавалі і канцэнтратна-сіласны тып кармлення жывёл. На самай справе ён павінны быць сянажным і рэгуляваца канцэнтратамі. Таму гэты недабор дазволіць нам больш рацыянальна падысці да справы і перагледзець тэхналагічныя падыходы. Мы спачатку бачылі гэтую праблему. Таму і зрабілі ўпор на нарыхтоўку кармоў, асабліва імкнуліся больш назапасіць сенажу. Мы раней прыступілі да ўборкі траваў. Для ўзмацнення гэтай работы зноў жа закупілі каля 65 кормаўборачных камбайнаў. На сённяшні дзень шчыльна працуем па кукурузе. Зялёную масу практычна на падкормку жывёле не даём, каб зімой арганізаваць паўнавартасны рацыён. Думаю, што такі тып кармлення дасць магчымасць аздаравіць грамадскі статак.

***— Цяпер пытанні захавання і ўкаранення новых тэхналогій для сельскай гаспадаркі Міншчыны на першым плане. Ці не так?***

— Бясспрэчна, так. Для таго каб канкурыраваць на рынку харчавання, неабходны якасць і сабекошт прадукцыі. А дасягнуць гэтых параметраў можна за кошт тэхналогій. Таму, як сказаў Прэзідэнт, дыктат тэхналогій — у першую чаргу. Патрэбна захоўваць усе працэсы, закладзеныя ў вырошчванні той ці іншай культуры, тады і будзем мець вынік. Пытанне нават не ў аб'ёмах атрымання таго ці іншага віду прадукцыі, мы ад гэтага адышлі. Хапае ў нас і мяса, і малака, і зерня, нават з улікам недабору. Задача ў тым, каб дасягнуць якаснага ўзроўню вытворчасці прадукцыі са зніжэннем затрат.

***— Шчыра, цяжэй вам было ў папярэднія гады або цяпер, калі даводзіцца адказваць за ўсю вобласць?***

— На сяле ніколі не было лёгка. Трэба адносіцца з душой да работы незалежна ад пасады. Хлеб саспеў, яго неабходна ўбраць, бо туды столькі ўкладзена працы. Па сутнасці, сёння мы ўжо закладваем ураджай будучага года. Лічыце, што цэлы год будзем працаваць на гэтае зярнятка, каб яно саспела, налілося. Таму, дзе складаней, а дзе прасцей, цяжка сказаць. Усюды ёсць свае асаблівасці. Інжынерам таксама з раніцы да вечара даводзілася працаваць, былі свае праблемы. Непасрэдна выязджаў на палеткі, займаўся рамонтам тэхнікі, зернесушыльнымі комплексамі, камбайнамі, дзесьці сам удзельнічаў у жніве. Тут работа выбудоўваецца паіншаму. Я сказаў бы, што яна больш звязана з арганізацыяй: закупкай запчастак, камбайнаў, паліва, выкананнем дзяржзаказу, рэалізацыяй збожжа. Сёлета вобласць набыла, дарэчы, 100 камбайнаў. Тэхніка гомельскай вытворчасці вельмі добрая, выдатна сябе зарэкамендавала, працавала практычна без паломак.

***— Ад таго, як папрацуюць вяскоўцы восенню, залежыць будучы ўраджай. Які задзел на наступны год?***

— Мы своечасова пасеялі рапс, павялічылі плошчы крыжакветных культур на 130 % да ўзроўню мінулага года. Цяпер займаемся сяўбой азімых культур, клін іх будзе большы, чым летась. Да 1 верасня адсеемся. Штодзень засяваем каля 12 тысяч гектараў. Ужо падрыхтавана каля 200 тысяч гектараў глебы. Гэта сур'ёзны задзел на будучыню. Набылі трактары. На сённяшні дзень маем каля 120 трактароў, закупляем яшчэ 30, што дазваляе выкарыстоўваць элементы дакладнага земляробства. Кожны трактар бачны на камп'ютары: які аб'ём работ выканаў, колькі гектараў зааараў. Дзякуючы гэтаму, мы адсочваем і павялічваем тэмпы ворыва.

Мы вызначылі, што чалавек за ўзараны гектар павінен атрымліваць грошы, эквівалентныя долару. Гэта дадатковая матывацыя лепш працаваць і больш зарабляць.

***— Апошнім часам у вобласць прыйшла цэлая кагорта маладых спецыялістаў, кіраўнікоў сельгасарганізацый, раёнаў. Па якіх крытэрыях падбіраюцца кадры?***

— Крытэрыяў шмат. Самае галоўнае, каб раён рухаўся наперад. Важна, каб надоі і прывагі служылі яго развіццю. Кіраўнік павінен рухаць, развіваць сваю тэрыторыю па ўсіх кірунках: дарогі, інфраструктура, сацыяльная сфера, жыллё. Усё павінна вырашацца комплексна і быць завязана на канчатковы вынік.

У вобласці ў агульнай колькасці працаўнікоў каля 30 % маладых кіраўнікоў, спецыялістаў, механізатараў. Раней моладзь Міншчыны цікавіў у першую чаргу ўзровень заробкаў. Цяпер, паводле вынікаў сацыялагічнага апытання, маладыя людзі ставяць пытанне аб нармальным рабочым дні. Сямейныя каштоўнасці пачалі набываць для іх першаступеннае значэнне.Яны хочуць больш пабыць з сям'ёй, больш увагі ўдзяляць выхаванню дзяцей, пагуляць з імі, некуды паехаць адпачыць. Гэтаму трэба радавацца. Будзем думаць, як вырашыць пытанне.

***— Што б вы хацелі пажадаць хлебаробам Мінскай вобласці напярэдадні свята дажынак?***

— Міру, дабра, упэўненасці ў заўтрашнім дні, любові да радзімы, блізкіх людзей, здароўя. А яшчэ, каб зямля радзіла і ім у нялёгкай працы крыху дапамагаў Бог. Астатняе зробім самі, усё ў нашых руках. Калі ёсць людзі, спецыялісты, тэхніка, дзяржава — усё будзе добра.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Хакеістам — сучасныя пляцоўкі

У Наваполацку рэканструююць Лядовы палац «Хімік». Здаць яго будаўнікі павінны да канца года

**Спартыўнае збудаванне пабудавалі некалькі дзесяцігоддзяў таму. Зразумела, яно патрабавала капітальнага рамонту. Першая спроба мадэрнізацыі была зроблена ў 2008-м. Але з-за дэфіцыту грошай аказалася няўдалай.**

У мінулую суботу на аб'екце пабывалі адказныя асобы з Мінска і абласнога выканаўчага камітэта.

**Міністр архітэктуры і будаўніцтва Дзмітрый МІКУЛЁНАК** агучыў некалькі наракканяў на адрас праекціроўшчыкаў, будаўнікоў, якія, на яго погляд, вінаваты ў нязладжанасці дзеяння. Свае думкамі падзяліліся і **Віталь ВОЎК, памочнік Прэзідэнта Беларусі — інспектар па Віцебскай вобласці,** нядаўна прызначаны на гэтую пасаду, **першы намеснік міністра спорту і турызму Вячаслаў ДУРНОЎ** і іншыя.



На тэрыторыі Лядовага палаца «Хімік».

Іх у сваю чаргу запэўнілі, што ўсе тры этапы рэканструкцыі завершаць своечасова. У прыватнасці, ужо ў кастрычніку мясцовая каманда «Хімік» зможа трэніравацца ў родных сценах. Пакуль яна робіць гэта ў Оршы ці абласным цэнтры.

Падчас мадэрнізацыі Лядовага палаца заменяць табло, сістэмы асвятлення і вентыляцыі, месцы для гледачоў (на 1,2 тысячы чалавек) і гэтак далей.

Пільную ўвагу ўдзельнікі камісіі ўдзялілі новаму аб'екту — крытай трэніровачнай пляцоўцы. Металічныя каркасныя канструкцыі заказалі ў Канадзе... Гэты «лёд» неабходны, каб разгрузіць галоўную пляцоўку.

Шмат гараджан і жыхароў суседняга Полацка любяць катацца на каньках круглы год. Таму ў хуткім часе змогуць зрабіць гэта на яшчэ адной пляцоўцы.

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» **Уладзімір БЕЛАВУС, намеснік старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта,** усе арганізацыйныя пытанні (ад распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі да заключэння дагавароў падраду) цалкам выканабыя.

На месцы «штабы» з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады, праекціроўшчыкаў і будаўнікоў збіраюцца мінімум два разы на тыдзень.

**Старшыня Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ** дадаў, што, калі спатрэбіцца, будаўнікі будуць працаваць і ў дзве-тры змены для выканання ў тэрмін пастаўленых задач.

Лядовы комплекс пасля рэканструкцыі стане цудоўным падарункам гараджанам. Ён дазволіць падрыхтаваць яшчэ больш таленавітых гульцоў. Яны годна будуць прадстаўляць родны горад на турнірах у Беларусі і адстойваць гонар краіны на міжнародных спаборніцтвах.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Наваполацк — Віцебск.*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Іран гатовы перакрыць Армузскі праліў



Тэгеран можа перакрыць Армузскі праліў. Такі сцэнарый не выключыў прэзідэнт Ірана Хасан Рауhані, калі ЗША працягнуць санкцыйную палітыку ў дачыненні да яго краіны. Пра гэта ён заявіў у інтэрв'ю амерыканскаму тэлеканалу NBC. «Калі ЗША хочуць выкарыстоўваць сілу, каб з дапамогай санкцый абмежаваць нафтавую прамысловасць Ірана, то гэта, несумненна, выкліча адпаведную рэакцыю (Тэгерана)», — сказаў ён. Як вядома, Армузскі праліў, стратэгічна вельмі важная водная артэрыя даўжынёй каля 200 кіламетраў і шырынёй крыху больш за 50 кіламетраў, злучае Аманскі і Персідскі залівы. Ён лічыцца адным з найважнейшых транспартных маршрутаў планеты. Па даных Упраўлення па энергетычнай інфармацыі, па ім штодня праходзіць больш за 17 мільёнаў бараляў нафты з нафтаздабываючых краін Персідскага заліва — амаль трэць усяго сусветнага экспарту «чорнага золата».

## У Мексіцы ваенныя раззброілі паліцыю Акапулька з-за яе сувязяў са злачынцамі

Падраздзяленні сухапутных войскаў і марской пяхоты Мексікі раззброілі супрацоўнікаў паліцыі горада-курорта Акапулька ў штаце Герэра, перадае ТАСС. Гэта было зроблена ў сувязі з падазрэннем у датычнасці вартавых парадку да незаконнай дзейнасці і магчымым пранікненнем у іх шэрагі злачынцаў, паведаміў прадстаўнік сіл бяспекі рэгіёна Раберта Альварэс Эрэдыя. «У аперацыі ўзялі ўдзел Міністэрства нацыянальнай абароны і ваенна-марскога флоту, федэральная паліцыя, генеральная пракуратура і паліцыя штата, якія раззброілі муніцыпальную паліцыю», — адзначаецца ў заяве, якую апублікаваў Эрэдыя. Сілавікі акружылі казармы паліцыі і затрымалі ва ўнутраным двары падазраваных. Акапулька апынуўся на трэцім месцы з 50 у рэйтынгу самых небяспечных гарадоў свету па выніках 2017 года. Узровень забойстваў там дасягнуў 106 выпадкаў на кожныя 100 тысяч жыхароў.

## Раман Абрамовіч прызнаны пагрозай грамадскай бяспецы Швейцарыі



Швейцарыя адмовілася даць від на жыхарства расійскаму мільярдэру Раману Абрамовічу, палічыўшы яго крыніцай пагроз для грамадскай бяспекі. На думку ўлад, знаходжанне мільярдэра на тэрыторыі краіны можа нанесці шкоду іх рэпутацыі. А фэдэральнае ведамства крымінальнай паліцыі Швейцарыі заявіла, што знаходжанне ў краіне бізнесмена непажаданае, бо ведамства мае ў дачыненні да яго «падазрэнні ў адмыванні грошай і меркаваных кантактах са злачыннымі арганізацыямі», паведамляе газета The Guardian. Менавіта таму бізнесмен не змог атрымаць від на жыхарства ў Канфедэрацыі.

# Адкрываецца абноўлены ўчастак трасы

**Уводзіцца ў эксплуатацыю першы ўчастак працягласцю 13,3 кіламетра на тэрыторыі Шчучынскага раёна аўтамагістралі М6, якая зараз рэканструюецца. Усяго рэканструкцыяй ахоплена больш за 153 кіламетры М6, з якіх 120 — у Гродзенскай вобласці. Цалкам абноўленую магістраль гродзенцы ўвядуць у эксплуатацыю да 7 лістапада.**

Па інфармацыі РУП «Гроднааўтадар», дарога з двух палос пашырылася да чатырох, на раздзяляльнай паласе ўстаноўлены жалезабетонныя блокі, якія прадухіляць лабавыя сутыкненні. Для павышэння бяспекі дарожнага руху пабудавана 10,5 кіламетра пешаходных дарожак. Па іх могуць спакойна ехаць і веласіпедысты. Для прадухілення выхаду лясных жывёл на праезную частку на ўсім працягу гэтага ўчастка ўстаноўлены агароджы з металічнай сеткі, для іх пабудаваны падземны пераход. Месца яго ўладкавання пад дарогай вызначылі вучоныя НАН Беларусі сумесна з леснікамі і паляўнічымі.

Уся дарожная разметка выканана з тэрмапластыку, абсталяваны шумавыя палосы ў найбольш аварыйна-небяспечных месцах. Ва ўсіх прымыкаючых да магістралі населеных пунктах устаноўлены аўтапавільёны. Каля іх выканана пешаходная разметка, падведзена асвятленне.

Пра адпачынак кіроўцаў таксама падбалі: абсталяваны дзве пляцоўкі. Дарэчы, адна мадэрнізавана, другая пабудавана. Каля гэтых пляцовак з'явілася магчымасць развіваць і прыдарожны сэрвіс.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Камунальныя стасункі

# СТАЛІЦА РЫХТУЕЦЦА ДА ЗІМЫ

## Ацяпленне па графіку, прыбіранне падвалаў і юбілейныя пасадкі

**Батарэі стануць гарачымі, калі сярэднясутачная тэмпература на вуліцы будзе не большай за 8 градусаў на працягу пяці дзён. Камунальнікі разам з жыхарамі пазбавяцца ад непатрэбных рэчаў з балконаў і прыбяруцца ў падвалах і пад'ездах. А «Мінскзеленбуд» падчас кастрычніцкіх суботнікаў пакажа мінчанам, як правільна саджаць дрэвы і кусты. Пра гэтыя і іншыя задачы па добраўпарадкаванні сталіцы і яе падрыхтоўцы да зімы расказалі спецыялісты.**

### КАПРАМОНТ ДВАРОЎ І НОВЫЯ ПАРКОЎКІ

Больш за 25 тысяч дрэў, звыш за 50 тысяч кустоў і больш як 9 мільёнаў кветак сёлета азелянілі сталіцу. А больш як 1000 прадпрыемстваў добраўпарадкавалі свае тэрыторыі.

— Праведзены агляд-конкурс на найлепшае добраўпарадкаванне, утрыманне і кветкавае афармленне аб'ектаў вызначыў пераможцаў. Яны атрымалі дыпломы і прызы. Гэта стымул для суб'ектаў гаспадарання не толькі падтрымліваць на сваіх тэрыторыях чысціню, але і добраўпарадкаваць яе, — заўважыла **Марына МАЛАЕВА, начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама.**

Добраўпарадкавана таксама больш за 650 дваровых тэрыторый. Бягучы рамонт па паляпшэнні пакрыццяў вуліц і дваровых праездаў зроблены больш як на 800 тысячах м$^2$. У сталіцы з'явілася звыш 6000 дадатковых паркавачных месцаў і больш як шэсць інжынерных збудаванняў для захавання аўтамабіляў: стаянак і падземных гаражоў-стаянак.

Пасля перапынку ў некалькі гадоў сёлета ў сталіцы аднавілі работу па капітальным рамонце дваровых тэрыторый. У трох з дзесяці двароў 12 жылых дамоў, запланаваных да капрамонту, работы канчаткова завершаны.

— Наступным годам плануецца адрамантаваць такім чынам 28 двароў для 47 дамоў. Мы мяркуем, што гэтая работа будзе адноўлена і стане правядзіцца пастаянна, — спадзяецца **Галіна ГІЛЕВІЧ, начальнік аддзела землеўпарадкавання і капітальнага рамонту дваровых тэрыторый Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.**

У пералік работ па капрамонце двароў уваходзіць пашырэнне праездаў, рамонт асфальтавага пакрыцця, замена пешаходных дарожак, уладкаванне кантэйнерных пляцовак, стварэнне дадатковых месцаў для паркоўкі, абрэзка аварыйных дрэў, устаноўка дзіцячага абсталявання і малых архітэктурных формаў і іншае.

### АБНАЎЛЕННЕ СМЕТНІЦ І ПАД'ЕЗДАЎ

Месячнік па добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторый, які мае на мэце дапамагчы мінчанам падрыхтавацца да зімы, пачнецца 1 кастрычніка. За гэты месяц мяркуецца прыбраць у горадзе лісце, добраўпарадкаваць двары, адрамантаваць больш як 130 тысяч м$^2$ пакрыцця дарог і звыш 250 прыпынкаў.

— Падчас месячніка плануецца пасадзіць больш як шэсць тысяч дрэў і 20 тысяч кустоў. Аднак пасадка зялёных насаджэнняў працягнецца да канца года, — дадала Марына Малаева і выказала спадзяванне, што да работы падчас суботнікаў далучацца працоўныя калектывы і жыхары.

Падчас месячніка традыцыйна будуць прыбраны пад'езды, падвалы, двары, адрамантаваны газоны. Сумесна з жыхарамі плануецца дагледзець зялёныя насаджэнні. А разам з арганізацыямі, якія аказваюць паслугі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі, і жыллёвымі арганізацыямі — навесці парадак на кантэйнерных пляцоўках, расказала Галіна Гілевіч:

— Такая работа патрабуе пастаяннага ўдзелу і абнаўлення. Кантэйнеры знаходзяцца на вуліцы, а гэта і дождж, снег, з імі працуюць механізмы машын.

### 100 ЯБЛЫНЬ, 30 ЯСЕНЯЎ І 10 ТЫСЯЧ ХВАЁВЫХ

«Мінскзеленбуд» у кастрычніку плануе высадзіць каля 5000 дрэў і 11 тысяч кустоў. Асноўныя месцы пасадкі: кальцавая аўтадарога, паркі і скверы. У пэўных месцах пасадкі прымяркуюць да юбілейных дат розных арганізацый.

Напрыклад, у Лошыцкім парку зробяць алею з памятным каменем, прысвечаную 100-годдзю МУС. У гонар 45-годдзя «Мінскзеленбуда» Заводскага раёна высадзяць алею з 30 ясеняў. Яшчэ адна алея з'явіцца ў гонар 80-годдзя Савецкага раёна сталіцы, расказала **Анжаліка ПУЗАНКОВА, кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі «Мінскзеленбуда»:**

— 100 яблынь па ініцыятыве БРСМ моладзь высадзіць у парку Перамогі, а ў парку Курасоўшчына абсталююць і адкрыюць экасцежку. Усе гэтыя мерапрыемствы ўжо адпрацаваны, пад іх адабраны пасадачны матэрыял і вызначаны месцы высадкі.

Сталічныя азеляняльнікі гатовыя дапамагчы ўсім ініцыятыўным грамадзянам і арганізацыям з падборам пляцоўкі для пасадкі раслін, даць інструмент і вытрымаць тэхналогію пасадкі. Акрамя таго, мяркуецца прыбраць прыгарадныя лясы.

Да канца года таксама будуць азеляняцца тэрыторыі школ, аб'ектаў будаўніцтва ва Уруччы, для эстэтызацыі праспекта Пераможцаў высадзяць больш як 10 тысяч хваёвых раслін.

### ШТРАФЫ ЗА ЖЫВЁЛ І КІНУТЫЯ АЎТО

У кастрычніку камунальнікі разам з прадстаўнікамі прадпрыемстваў «Экарэс» і «БелВТІ» запланавалі больш як 50 акцый па зборы ў насельніцтва непатрэбнай бытавой тэхнікі. Жыхарам прапануюць таксама ачысціць ад лішніх рэчаў свае балконы і месцы агульнага карыстання.

Сумесна з прадпрыемствам «Фаўна горада» жыллёвыя службы правераць, як мінчане ўтрымліваюць хатніх жывёл. Ужо адбылося больш як 40 рэйдаў, падчас якіх правяралі рэгістрацыю гадаванцаў і правілы іх выгулу. Па выніках склалі больш за 20 пратаколаў, каля 20 чалавек аштрафавалі больш як на 1000 рублёў.

Разам з ДАІ камунальнікі плануюць таксама прасачыць, як машыны паркуюцца ў дварах і ці ёсць там кінутыя аўто. У Мінску ўжо было знойдзена больш як 2000 такіх машын. Амаль палову з іх прывялі ў больш-менш належны стан, частку — утылізавалі, частку — перамясцілі для захавання ў іншыя месцы. Уладальнікаў больш як 1000 аўто шукаюць або рыхтуюць ім дакументы ў суд ці даюць час на эвакуацыю старой машыны.

**Ірына СІДАРОК**

■

■ На слыху

# ВЫБУХ У ЦЭХУ

## Што ж адбылося на прадпрыемстве ў Магілёве

**У аўторак у 18.38 у МНС паступіла паведамленне аб выбуху ў цэху ААТ «Магілёўдрэў». На момант здарэння ў ім знаходзілася рабочая змена з дзевяці чалавек, усе яны самастойна пакінулі будынак. Пацярпелі шэсць чалавек, яны былі шпіталізаваны з тэрмічнымі апёкамі ў Магілёўскую бальніцу № 1 і Магілёўскую бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі. Іх стан медыкі ацэньвалі як цяжкі і сярэдняй ступені цяжкасці. Такой была першасная інфармацыя пра надзвычайнае здарэнне.**

З падрабязнасцяў МНС паведаміла, што ў адной з фарбавальных камер, размешчаных у цэху, адбылося разбурэнне сцяны з сэндвіч-панэляў на плошчы 300 квадратных метраў, шасці аконных блокаў, 10 квадратных метраў шклення, былі пашкоджаны паветраводы, а абсталяванне не пацярпела.

«Адбыўся воплеск, выбух. Што канкрэтна — пакуль гаварыць рана. На месцы працуе камісія». Такім быў на той момант каментарый **афіцыйнага прадстаўніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Вадзіма УРУБЛЕЎСКАГА.**

Старшыня Следчага камітэта Іван Наскевіч узяў пад асабісты кантроль расследаванне крымінальнай справы па факце выбуху ў ААТ «Магілёўдрэў», паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю СК.

Раніцай у сераду Іван Наскевіч прыехаў у Магілёў і праверыў аператыўную работу са следчай групай, створанай для расследавання крымінальнай справы. Кіраўнік ведамства азнаёміўся з вынікамі першапачатковых следчых дзеянняў, даў шэраг указанняў для каардынацыі далейшых дзеянняў структур, якія ўзаемадзейнічаюць, а таксама паставіў ход расследавання на асабісты кантроль. «Абмеркаваны меры, неабходныя для бесперабойнага функцыянавання прадпрыемства і недапушчэння падобных выпадкаў у будучыні», — праінфармавалі ў СК.

Па факце выбуху на ААТ «Магілёўдрэў» распачата крымінальная справа па прыкметах складу злачынства па ч. 2 арт. 302 КК РБ (парушэнне правілаў вытворча-тэхнічнай дысцыпліны і правілаў бяспекі, што пацягнула выбух і прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў работнікам прадпрыемства). Следчыя працягваюць работу на прадпрыемстве.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Крымінал, здарэнні

## Не пашанцавала двойчы

**Гаворка ідзе пра чыноўніка з Манголіі, які быў заўважаны на радзіме ў справе карупцыі.**

Першы раз яму не пашанцавала, калі факты атрымання хабару сталі вядомыя мясцовым праваахоўнікам. Тады служачы з Улан-Батара вырашыў збегчы ад правасуддзя і накіраваўся з жонкай у бок Еўропы. У Германіі ў яго жывуць сваякі. Апошняе ён паведаміў брэсцкім вартавым мяжы, калі яго затрымалі ў раёне вёскі Церабунь пры спробе нелегальна перайсці мяжу.

Няўдачлівы нелегал усё пра сябе расказаў, калі іх з жонкай прывезлі на заставу. Паводле інфармацыі **афіцыйнага прадстаўніка Брэсцкай пагранічнай групы Сяргея ДЗМІТРЫЕВА,** парушальнікаў памежнага заканадаўства чакаюць дэпартацыя і забарона на ўезд у Беларусь тэрмінам да пяці гадоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Міліцэйскае ўпраўленне эвакуіравалі з-за падазроных сумак

**Таксіст прывёз забытыя пасажырам падазроныя сумкі ў Савецкае РУУС сталіцы, іх правяралі сапёры, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.**

Як высветлілася, таксіст прыехаў па кліента, каб даставіць таго ў Нацыянальны аэрапорт Мінск. Ён загрузіў вялікія сумкі пасажыра ў багажнік. Мужчына арабскай знешнасці па праездзе ў аэрапорт папрасіў кіроўцу пачакаць і пайшоў мяняць грошы — у яго не было беларускіх рублёў, каб расплаціцца. Свае рэчы ён пакінуў у багажніку машыны. Праз доўгі час мужчына не вярнуўся. Таксіст прывёз падазроныя сумкі ў Савецкае РУУС сталіцы. Супрацоўнікі ўпраўлення ачапілі перыметр будынка, эвакуіравалі людзей і выклікалі брыгаду сапёраў. Сумкі агледзелі, выбуховай прылады не знайшлі. Праводзіцца праверка і ўстанаўліваецца ўладальнік багажу.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Год малой радзімы ў рэгіёнах

# ВЕДАЦЬ СВОЙ КРАЙ

## Папаўняецца бібліятэка краязнаўчага альманаха «Астрамечаўскі рукапіс»

**Любая вялікая справа складаецца з малых, паслядоўных крокаў. Так і з выданнем Брэсцкага раённага краязнаўчага альманаха «Астрамечаўскі рукапіс». Ужо пабачыла свет 23 яго выпускі.**




Выходзіць па-свойму ўнікальнае выданне штоквартальна, пачынаючы з 2013 года. Сёння, калі часопісы, увогуле папяровыя выданні ўзнікаюць як першы снег і раптоўна знікаюць, такі вопыт дарагога каштуе. Рэдактар і укладальнік творчага праекта — брэсцкі літаратар Аляксандр Валковіч. Заснавальнік — Брэсцкі раённы выканаўчы камітэт. Падтрымку ў рэалізацыі задуманага найперш аказвае, безумоўна, аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага райвыканкама. А яшчэ — Брэсцкая раённая бібліятэчная сетка, Брэсцкае аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Пра змест, характар альманаха гавораць традыцыйныя рубрыкі выдання: «Астрамечава і астрамечаўцы», «Чароўныя спевы і паданні спадчыны», «Скарбніца народных талентаў», «Маладое дрэва», «Літаратурная сядзіба», «Карані», «Старонкі гісторыі», «Калаўрот культурнага жыцця», «Мая малая радзіма». Фактычна ў краіне няма ніводнага выдання падобнага характару. Дакладна няма ніводнага выдання ў перыёдыцы, якое б так настойліва прапагандавала фальклорную спадчыну. Тым больш што ў полі зроку даследчыкаў, аўтараў, укладальніка і рэдактара «Астрамечаўскага рукапісу» — канкрэтны, невялікі па тэрыторыі рэгіён. Прыйдзе час — і наступныя пакаленні даследчыкаў народнай спадчыны будуць звяртацца менавіта да старонак краязнаўчага альманаха. Прыемна, што выданне ўдзяляе шмат увагі моладзі, яе творчым дасягненням, здабыткам.

**Сяргей ШЫЧКО**

■

■ Бяспека

## ЛІГА ЧЭМПІЁНАЎ АХОВЫ

**Стартаваў XV адкрыты рэспубліканскі агляд-конкурс прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь.**



Восем камандаў з прадстаўнікоў шасці абласных, Мінскага гарадскога ўпраўленняў, упраўлення па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў змагаюцца за званне найлепшых па шэрагу намінацый. Змагацца ёсць за што. Каманда-пераможца атрымае галоўны прыз — новы службовы аўтамабіль.



Гасцямі агляду-конкурсу сталі прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення аховы МУС Рэспублікі Узбекістан і прадстаўніцтва Цэнтральнай акругі войскаў нацыянальнай гвардыі Расійскай Федэрацыі.

У прывітальным слове **начальнік Дэпартамента аховы МУС генерал-маёр міліцыі Сяргей ХАМЕНКА** заўважыў:

— Асноўная мэта агляду-конкурсу — не першае месца. Галоўнае, каб кожны з прысутных забяспечыў спакой на тэрыторыі нашай роднай зямлі. Я назваў бы гэтыя спаборніцтвы, калі праводзіць аналогію са спортам, Лігай чэмпіёнаў сярод найлепшых супрацоўнікаў Дэпартамента аховы МУС. Адным з дэвізаў нашай службы з'яўляецца выраз «Ваша бяспека — наша праца». Гэты зварот — да тых людзей, якія жывуць побач з намі. І ў гэтых словах — аператыўнасць рэагавання на любыя сітуацыі, якія могуць узнікнуць у нашых грамадзян.

Праграма агляду-конкурсу вельмі насычаная і цікавая. Конкурс будзе доўжыцца чатыры дні. Ужо ў першы дзень навыкі і ўменні прадэманстравалі кінолагі разам са сваімі чатырохногімі гадаванцамі. Яны на хуткасць пераадольвалі паласу перашкод, а таксама ўдзельнічалі ў затрыманні ўмоўнага зламысніка.

Акрамя таго, удзельнікаў спаборніцтва чакаюць такія дысцыпліны, як спецыяльны курс дрэсіроўкі службовых сабак (следавая работа), дэманстрацыя тэхнікі валодання баявымі прыёмамі барацьбы і хуткаснае манеўраванне аўтамабілем. Будзе таксама экзамен па медыцынскай падрыхтоўцы, выбарка службовымі сабакамі рэчаў і чалавека. Завяршыць апошні дзень агляду-конкурсу самае, напэўна, відовішчнае спаборніцтва — камбінаваная міліцэйская эстафета.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**
**Фота Кастуся ДРОБАВА**

# «Будзем у «Аднакласніках» бачыць, як Раіса дадала новае фота»...



Пасля танцавальнага флэшмоба. *Справа* — Алена ЕЎДАКІМАВА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Фестываль «Крэатыўны ўзрост», прымеркаваны да Дня пажылога чалавека і Года малой радзімы, ужо ў поўным разгары. На пляцоўцы «Забаўлянкі на гулянцы» толькі што адгучала песня «пра гарэзную кумачку» — з разраду тых, што «з перцам», і на сцэне пачынаецца дэфіле модных «лукаў»: мадэльнай хадой выходзяць жанчыны пенсійнага ўзросту з Зэльвы — у сукенках і модных красоўках, у крэатыўных шаліках і туфлях на абцасах...

Наш час ламае многія стэрэатыпы, але некаторыя з іх настолькі моцна спаяныя, як, напрыклад, уяўленне пра старасць як пра «не радасць» і пасіўнае і бясполае існаванне, што, здаецца, патрабуецца нямала намаганняў, каб вызваліцца ад іх. Але гасцям гэтага фестывалю, мяркуючы па ўсім, няма ніякай справы да стэрэатыпаў, яны проста маюць намер добра пагуляць і павесяліцца.

Як сказала 64-гадовая Алена Еўдакімава з Зэльвы, «мы нічога не робім для «галачкі», напаказ, нам проста гэта падабаецца!». І ў гэтым, магчыма, адна з галоўных пераваг трэцяга ўзросту: ужо можна дазволіць сабе рабіць што захочацца, нічога і нікога не баючыся, не аглядаючыся па баках і не думаючы пра тое, што «скажуць іншыя».

— Мы ходзім у аддзяленне дзённага знаходжання для пажылых пры Зэльвенскім ТЦСАН, — энергічна расказвае Алена Еўдакімава, — і ў нас стварылася група, клуб «Даўгалецце праз рух». Займаемся ёгай два разы на тыдзень, праводзім тэатральныя вечары, адзначаем разам усе дні нараджэння, робім канцэрты, выязджаем у Мацейкі да інвалідаў (там знаходзіцца аддзяленне кругласутачнага знаходжання ТЦСАН. — **Аўт.**).

**Фестываль «Крэатыўны ўзрост» на Зэльвеншчыне прайшоў у аграсядзібе фермера Міхаіла Макея «Верас» (вёска Казловічы).**

Мы яшчэ і валанцёры! У кожнай з нас ёсць падапечныя інваліды і ветэраны. Ім шмат не трэба — дастаткова пагаварыць, схадзіць у краму ці ў аптэку па лекі. Нам гэта няцяжка, наадварот, прыносіць задавальненне... На адным са сваіх пасяджэнняў мы вырашылі, што будзем скідвацца кожны месяц па рублі. З гэтых грошай купляем падарункі да свят маленькім дзеткам, ад якіх адмовіліся бацькі, ці старэнькім бабулям-дзядулям, робім салодкія сталы. Неяк правялі спартакіяду, на якой спаборнічалі з інвалідамі. Абручы круцілі, мячы кідалі...

— Навошта мы ўсім гэтым займаемся? — перапытвае яна. — Ды таму што калі сядзець на пенсіі дома, то нейк сумна жыць становіцца. Дзеці ў нас раз'ехаліся хто куды, толькі ўнукаў падкідваюць на канікулы. А нам хочацца рабіць нешта добрае. Вось я зараз поўная сіл, а хтосьці не можа хадзіць, камусьці вельмі самотна і няма з кім пагаварыць... Нам хочацца палепшыць іх жыццё, нас гэта натхняе, надае сіл. Мне падабаецца так жыць!

* * *

Алена Еўдакімава разам з сяброўкамі пабегла ладзіць танцавальны флэшмоб, а са сцэны тым часам спусціўся 65-гадовы Міхаіл Пазнанскі з групы пенсіянераў «Спявай, душа!», усё з той жа Зэльвы. Як ліха ён танцаваў! І вельмі вылучаўся на фоне жаночага «кветніка». Яшчэ б, беларускія мужчыны-пенсіянеры пакуль у абсалютнай меншасці на любых сустрэчах і тусоўках. Але ў Міхаіла Пазнанскага сітуацыя ў сям'і складваецца процілеглым чынам: ён вядзе сацыяльна актыўны лад жыцця, а жонка нікуды не ходзіць, толькі ўнукамі займаецца. «Ці раўнуе мяне? Не, ні да кога не раўнуе!» Больш ён нічога сказаць не паспявае. «Ідзем, нам зараз танга танцаваць!» — цягне яго за руку партнёрка па танцах...



Лёгкім крокам...

— ...Глядзі, як вытанцоўваюць! — чую я вокліч ззаду. Гэта дзеляцца ўражаннямі сужэнцы, якія прыехалі на фестываль з Мастоў. Са сцэны гучаць музычныя куплеты, а ў імправізаванай грымёрцы ў альтанцы, дзе пераапранаюцца самадзейныя артысткі, раздаюцца свае песні. Відаць, душа не наспявалася, хочацца яшчэ... Тым часам хтосьці пайшоў на сустрэчу з Ягорам Хрусталёвым, хтосьці — на кулінарны майстар-клас, а нехта, па-хуткаму прыхарашыўшыся перад кішэнным люстэркам, пазіруе побач са скульптурай ільва, што стаіць каля ўваходу ў кафэ. «Ну, дзяўчаты, сёння будзем у «Аднакласніках» бачыць, як Раіса дадала новае фота!», — смяецца «моладзь» 60+...

* * *

Каля стэнда «Разам да здароўя», які арганізавала ініцыятыўная група «Жывіца» з вёскі Паўлава, што пад Слонімам, — 81-гадовая сланімчанка Галіна Сазонкіна. Кажа, што ездзіць займацца фітнесам менавіта сюды, у Паўлава: «У іх прыгожая спартыўная зала, шмат трэнажораў... Што такое 20 кіламетраў? Я на ровары езджу на трэніроўкі...» Мяркуючы па ўсім, яна не лічыць гэта нечым незвычайным: «У мяне дачка жыве ў Вялікай Бераставіцы, гэта 106 кіламетраў ад Слоніма, дык я да яе неаднаразова ездзіла на ровары ў госці, яшчэ пяць гадоў таму. У мінулым, ды і ў гэтым годзе бегла стаметроўку ў Гродне, а яшчэ з'яўляюся членам велаклуба, удзельнічаю ў велагонках — заняла першае месца».

Жыве Галіна Сазонкіна адна: «Асабістае жыццё не склалася, шчыра кажучы. Восем гадоў за мужжа, потым развяліся. Таму што я партыйная цётка». *(Смяецца.)* Расказвае, што ўдзельнічала ў дзвюх ударных камсамольскіх будоўлях і да гэтага часу лічыць сябе ідэйнай камсамолкай: «Мой лад жыцця — камсамол, я ўсё жыццё яму аддала. Зараз рыхтуемся да ягонага стагоддзя»...

* * *

Як бы ні хацелася паспець убачыць усё і ва ўсім паўдзельнічаць, гэта аказалася немагчыма. Столькі трэнінгаў і майстар-класаў праходзіла адначасова! І кулінарныя — на пляцоўцы «Гатуем сваё!», і па пляценні з папяровай лазы і вырабе лялек на творча-гандлёвай пляцоўцы «Свая справа», і па скандынаўскай хадзе на пляцоўцы «Здароўе для ўсіх», і па карыстанні гаджэтамі... А яшчэ госці маглі пачаставацца «Бабулінай гарбатай», памераць ціск і вызначыць свой індэкс масы цела, пабываць на прэзентацыі праграмы «Апека» і на майстар-класе па інтэрнэт-банкінгу ад Белаграпрамбанка і даведацца ўсё пра Е-дастаўку ад ТАА «Еўрагандаль», з якім, дарэчы, і прыехаў вядомы ўсім вядучы Ягор Хрусталёў.

**«Калі сядзець на пенсіі дома, то неяк сумна жыць становіцца. Вось я зараз поўная сіл, а хтосьці не можа хадзіць, камусьці вельмі самотна і няма з кім пагаварыць. Нам хочацца палепшыць іх жыццё, нас гэта натхняе, надае сіл. Мне падабаецца так жыць...»**

— Упершыню мы даведаліся аб правядзенні фестывалю «Крэатыўны ўзрост» у маштабах цэлай краіны ў Шатландыі. Ідэя натхніла нас зрабіць нешта падобнае і ў рэгіёнах Беларусі. Мы хочам паказаць велізарны патэнцыял людзей «ўзросту шчасця». Каб на фестывалі яны падзяліліся сваімі ведамі, талентамі, уменнем жыць з аптымізмам. Наша мэта — паказаць, што людзі «трэцяга ўзросту» запатрабаваны ў сучасным грамадстве, могуць жыць яркім і напоўненым жыццём, знайсці новыя захапленні, стварыць свой бізнес, праводзіць час з карысцю і задавальненнем, — кажа **адна з арганізатараў фестывалю Валерыя КЛІЦУНОВА, старшыня праўлення БГА «Адпачынак у вёсцы»**.

І, трэба сказаць, людзі сярэдняга ўзросту вельмі ўдзячная публіка. Простыя нашы пенсіянеркі прадэманстравалі такое жыццялюбства, такую эмацыянальнасць і запал, якія, калі шчыра, рэдка можна сустрэць у маладзейшых беларусаў. Думаю, многія ўнукі моцна здзівіліся б, убачыўшы, як умеюць «адрывацца» іх бабулі. «Мы калісьці добра працавалі, а цяпер павінны добра адпачываць!» — весела сказала адна з удзельніц фестывалю. І гэта, бадай, прыклад найлепшай жыццёвай філасофіі, якую мне даводзілася чуць.

Фестываль, прымеркаваны да Дня пажылога чалавека і Году малой радзімы, 23 верасня прайшоў у сямі рэгіёнах Беларусі на базе аграсядзіб. Такім чынам арганізатары — Беларускае грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы» пры падтрымцы Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Міністэрства інфармацыі — вырашылі прыцягнуць увагу да праблем людзей «трэцяга ўзросту» ў сельскіх рэгіёнах.

**Святлана БУСЬКО.**
**Фота Уладзіміра ПАЎЛАВА.**

# ПРА ВЫБАР, ЖАДАННІ І МАГЧЫМАСЦІ

Аповесць Уладзіміра Машкова «Як я быў вундэркіндам» была надрукавана ў беларускім выдавецтве «Юнацтва» больш як 35 гадоў таму — а актуальнасць не страчвае і сёння. Гэта якраз той выпадак, калі дарослым пачытаць дзіцячую кніжку не менш карысна, чым дзецям, — асабліва ў пачатку новага навучальнага года, калі ідзе набор у разнастайныя гурткі і секцыі.

Безумоўна, большасць бацькоў разумее, што самастойнасць і ўсебаковае развіццё — гэта выдатна, але ў дзяцінстве добра было б пакінуць час і на само дзяцінства, таму нагрузку на растучы арганізм трэба дазаваць і чаргаваць працу з адпачынкам. Гэта ў тэорыі, а на практыцы — школьныя настаўнікі настойліва раяць падцягнуць матэматыку і беларускую, для спіны карысней плаванне, а для інтэлекту — шахматы, да таго ж самому дзіцяці падабаецца танцаваць, дый пра будучую прафесію добра было б паклапаціцца загадзя, нездарма робататэхніка сёння ў трэндзе... А гадзін у сутках усяго дваццаць чатыры, і дзён у тыдні — сем, як ты ні ўшчыльняй графік.

І тут аднолькава баішся як таго, што дзіця круцёлкай-страказой будзе некалькі гадоў пераходзіць з гуртка ў гурток, выбіраючы сабе занятак па душы, ды ўсе і кіне, так і таго, што ты, няхай падсвядома, зробіш за яго свой выбар і будзеш дзе подкупам, дзе бацькоўскім аўтарытэтам прымушаць займацца нелюбімай справай (сярод маіх сяброў ёсць выпадак: хлопец уручыў шчаслівай маме дыплом музычнай школы па класе скрыпкі, і з таго часу ўжо 20 гадоў не адкрывае футарал з інструментам). А яшчэ занадта амбіцыйных бацькоў з завышанымі чаканнямі можа падсцерагаць неспадзяванка ў тым сэнсе, што раптам стан здароўя не дазволіць займацца абраным відам спорту, альбо канфлікт з педагогам адаб'е ўсю ахвоту займацца?.. Аддаць права выбару самому дзіцяці — таксама не найлепшы варыянт: у пяшчотным узросце наўрад ці хто зможа выбраць дадатковую адукацыю свядома, акрамя таго, значную ролю могуць адыграць мода і жаданне быць не горшым за сяброў, а не асабістыя схільнасці. А не рабіць наогул нічога, чакаючы, пакуль вашы нашчадкі «дарастуць» да ўласнага хобі — так, прабачце, можна і да старасці не дачакацца.

На мой глыбока суб'ектыўны погляд, задоўга да выбару секцыі, факультатыву ці гуртка трэба вызначыцца з мэтай: для чаго вам (і дзіцяці!) гэта трэба. Каб палепшыць школьныя адзнакі? Пазнаёміцца з рознымі прафесіямі? Развіць творчыя здольнасці, палепшыць «тэхніка-тактычныя характарыстыкі» арганізма? Вырасціць будучага чэмпіёна ці ўладальніка прэміі Грэмі? Што будзе, калі не атрымаецца? Усё адно лепш паспрабаваць, чым не рабіць нічога. І можа, з дзіцяці не вырасце новы Пласіда Дамінга ці Аляксандр Мядзведзь, аднак разнастайныя веды і ўменні — не той груз, які адцягне плечы.

Знайшла, між іншым, цікавыя лічбы і нагоду для роздуму ў бюлетэні Белстата «Адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь» 2017 года. Калі ў 2010 годзе дадатковую адукацыю дзяцей і моладзі ў нашай краіне забяспечвалі 383 разнастайныя ўстановы, то ў 2016-м — 297 (амаль на 100 менш!), пры гэтым колькасць навучэнцаў знізілася не так значна — з 415,4 тысячы чалавек да 389 тысяч. А вось дзіцячых школ мастацтваў хоць і стала менш (было 523, засталося 424), але колькасць іх вучняў, наадварот, вырасла са 104,8 тысячы чалавек да 114,6 тысяч. Сярод гурткоў па інтарэсах вырасла колькасць мастацкіх (з 12,3 да 14 тысяч), зменшылася — тэхнічных і спартыўна-тэхнічных (з 3700 да 3200), турыстычна-краязнаўчых (з 3200 да 2900), фізкультурна-спартыўных (4400 — 4100). Атрымліваецца, што праз 5—10 гадоў у нас будзе «перавытворчасць» спевакоў, мастакоў і музыкантаў, затое зведаем востры недахоп спартсменаў? Або бацькі кіруюцца меркаваннем, што лепш няхай дзіця мае творчае захапленне (якое нават калі не дазволіць уладкавацца ў жыцці, дык і шкоды не прынясе), чым ахвяруе здароўем у турпаходах і на зборах? А можа, усё значна прасцей і празаічней, як сказала мая добрая знаёмая з аддаленага райцэнтра: «Гэта вы там, у Мінску, можаце сабе дазволіць перабіраць, а ў нас які гурток ёсць, туды і аддасі дзіця, каб хоць нечым было занятае, а не па вуліцы бадзялася...» А вы як лічыце — справа ў бацькоўскіх магчымасцях, дзіцячых памкненнях ці наяўнасці выбару?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Сямейная газета

Выпуск № 18 (109)

Павел ХОЛАД:

# «У размовах з дзецьмі адкрываюцца недзіцячыя ісціны»



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Гэтую сям'ю чытачы «Сямейнай газеты» добра ведаюць па «Нататках шматдзетнага таткі». Іранічныя, але не пазбаўленыя філасофскай глыбіні замалёўкі, дзе ў галоўных ролях — дзеці, нікога не пакідаюць абыякавым. Нарэшце настаў час бліжэй пазнаёміцца і з самім аўтарам вясёлай рубрыкі — Паўлам Холадам, і яе героямі — усёй яго сям'ёй.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Бацькі і дзеці

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ НАВУЧАННЯ:

## Чытанне з пялюшак, фізіка з трох гадоў, робататэхніка з пяці?

**Сёння добрая частка людзей занятая ў прафесіях, пра якія яны не марылі ў маленстве. Папросту на той час іх яшчэ не існавала. А сёння большасці сучасных дзяцей даследчыкі (60—80 %) у розных краінах прадракаюць занятасць на работах, якія яшчэ трэба вынайсці. Развіццё тэхналогій, новыя адкрыцці ў розных навуковых галінах будуць патрабаваць ад работнікаў асаблівых навыкаў. Ці трэба гэта ўлічваць бацькам? Ці варта ўжо з самага далікатнага ўзросту «працаваць» над будучым дзіцяці? Што выйграюць ад такіх сучасных прапаноў нашы малыя? І ці не ўпускаем мы нешта важнае ў выхаванні дзяцей, захапляючыся ўсім тым, што хаваецца за словамі «ранняе развіццё»?**

### АДКУЛЬ БЯРУЦЦА ВУНДЭРКІНДЫ?

Вы заўважылі, як змяніліся дзіцячыя перадачы? Колькі інфармацыі праз іх падаецца маленькаму чалавечку! Нават мульцікі ненавязліва знаёмяць дзяцей з геаграфіяй, гісторыяй, біялогіяй, матэматыкай, тэхнікай і гэтак далей. З'явіліся новыя цацкі і і цэлыя гульні-комплексы, скіраваныя на работу з дзецьмі, у тым ліку і такія, як чытанне і матэматыка для немаўлят, замежная мова і творчасць з пялюшак. Акрамя прадуманых цацак, бацькам прапануецца безліч разнастайных дапаможнікаў і падручнікаў, майстар-класаў у сямейных цэнтрах, вэбінараў і адкрытых урокаў у інтэрнэце, дзе дарослых знаёмяць з тым, чаму і як вучыць дзяцей. З кожным годам усё больш разнастайнымі становяцца праграмы развіццёвых цэнтраў, і калі раней асноўнай прапановай была «падрыхтоўка да школы», дык сёння можна запісаць дашкольнікаў у арт-майстэрні, тэатральныя і кінашколы, студыі мультыплікацыі і мадэльныя агенцтвы, цыркавыя студыі, пазнаёміць з робататэхнікай, навучыць гатаваць... З чатырохгадовымі карапузамі ўжо нават праводзяць займальныя вопыты па біялогіі, хіміі і фізіцы, а з пяці малых могуць пачаць знаёміць з ментальнай матэматыкай (суперхуткасны лік у галаве).

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

■ Мамін дзённік

## Шчасце з эфектам стомленасці

Першы месяц быў самы складаны. Сынок увесь час крычаў. Снедаць, а таксама ажыццяўляць усе ранішнія рытуалы даводзілася з перапынкамі. Кашу прыгатую — ем ужо халодную: муж з малым ужо не спраўляўся.

Першыя тыдні жыццця малому была патрэбна толькі мама. Прызвычаіўшыся за дзевяць месяцаў да майго сэрцабіцця, сынок меў штохвілінную патрэбу ў знаёмым яму гуку. Астатняе — бразготкі, татава «агуканне» і дзіцячыя песенькі, уключаныя на смартфоне, — на яго доўга не дзейнічала. Дабіцца штылю ўдавалася, стварыўшы малому ўмовы па правіле трох «ц»: ціха, цёпла і цёмна. Не без выключэнняў — патрэбны былі яшчэ і маміны грудзі.

Прыбраць у кватэры альбо нешта прыгатаваць я магла тады, калі Арцемій з бацькам ці з бабулямі, што прыехалі на дапамогу, гуляў на вуліцы, — здаецца, толькі там ён і спаў. Займацца іншым хатнім клопатам даводзілася позна вечарам, калі, стаміўшыся ад сваёй жа актыўнасці і расслабіўшыся ў вадзе з рамонкам ці чарадой, ён, нарэшце, засынаў без ужо ўведзенага ў канон калыхання. Хоць дзве гадзіны, але яны ў мяне былі.

Што такое нармальны сон, я не ведаю дагэтуль. Быццам прайшоўшы школу маладога байца, я навучылася праглынаць цэлую талерку ежы за некалькі хвілін, адзявацца, як той салдат пасля каманды «пад'ём», рабіць манікюр і замаўляць талоны да дзіцячых урачоў падчас прагулкі на вуліцы, наводзіць парадак дома, калі лічаныя хвіліны малое знаходзіцца ў кагосьці на руках.

Парадак, канешне, гучна сказана. Спачатку гэткі вэрхал мяне, чысцюлю са стажам, моцна раздражняў. Толькі, як аказалася, з дзецьмі інакш не бывае. Спяшаючыся і раскідаючы ўсё на сваім шляху, збіраешся з малым на прагулку, увечары пад крык рыхтуеш яму ванну, носячы з кухні гарачую ваду і разбаўляючы яе халоднай, нервова шукаеш па тэрмометры патрэбную тэмпературу. Малое тым часам надрываецца — і тут голад не цётка.

Калі з хранічным недасыпам я амаль змірылася, то да спецыяльнай дыеты, вядома, гатова не была. Меркавала, што пасля нараджэння дзіцяці прыйдзецца адмовіцца ад салодкага і шматлікай колькасці любімых мною страў, але таго, што буду хадзіць паўгалодная (есці штодзень ялавічыну з грэцкай кашай, як рэкамендаваў урач, я проста не магла), нават не ўяўляла. Ужо ў радзільні пасля выпітай шклянкі яблычнага соку, які разлівала ў палаце жанчына ў белым халаце, на шчацэ майго сыночка з'явілася чырвоная пляма. Трэба было выбіраць: альбо я атрымліваю асалоду ад ежы, альбо маё дзіця не пакутуе ад алергіі.

Цяпер я ем практычна ўсё. Каб хоць крыху выспацца, стараюся класціся разам з малым. На раскіданыя па пакоі цацкі і іншыя дзіцячыя забаўкі гляджу з усмешкай. Відаць, так і выглядае шчасце.

**Вераніка КАНЮТА** ■

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ НАВУЧАННЯ...



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Вы сачылі за перадачай, дзе Максім Галкін знаёміў з «пупсамі», якія арыентуюцца ў геаграфіі, астраноміі, анатоміі і гэтак далей? Паверце, многія з гэтых дзетак зусім не вундэркінды — пры жаданні і вы сваіх малых у трох-пяцігадовым узросце можаце навучыць, напрыклад, распазнаваць сузор'і, адрозніваць сцягі, гербы і сталіцы краін, называць аўтараў найграных класічных мелодый ці шэдэўраў жывапісу і многаму іншаму. Нават для самых маленькіх выпускаюцца атласы, карты, размалёўкі, тэматычныя паштоўкі, цацкі, гульні і нават цэлыя камплекты (у якіх прадугледжана ўсё — ад разнастайных цацак да дапаможнікаў для бацькоў, дзе да дробязяў прапісана, як прыпаднесці інфармацыю малым, у наяўнасці дзясяткі тэматычных гульняў і нават аўдыя- і відэадыскі). Сёння вам падкажуць, як немаўлят навучыць замежным мовам, як з імі праводзіць эксперыменты і расказваць пра розныя адкрыцці ў галіне навукі і тэхнікі. І гэта сапраўды цікава і дзейсныя методыкі. Вы будзеце здзіўлены, як хутка і як многа ўсяго можа засвоіць малеча. Ёсць і спецыяльныя эстэтычныя праграмы для немаўлят. Напрыклад, з музыкай дзетак пачынаюць знаёміць нават тады, калі яны яшчэ знаходзяцца ў мамы ў жываце, а для немаўлят распрацаваны праграмы накшталт «каляровых нотак». Ужо ў такім узросце іх вучаць найгравацъ простыя мелодыі (зразумела, спачатку мамы самі цісунць дзіцячымі пальчыкамі на клавішы сінтэзатара, куды загадзя прычэплены каляровыя налепкі). А як толькі немаўля навучыцца сядзець — яму ўжо раяць даваць фарбы. І зноў жа прапануюцца разнастайныя дапаможнікі, гульні, наборы картак, якія дапамогуць пазнаёміць з колерамі і формамі.

Многаму малых могуць вучыць не чужыя цёткі ў нейкіх сямейных цэнтрах, а самі бацькі ў хатніх умовах. І самае галоўнае: вы не толькі развіваеце памяць і ўменне засвойваць вялікую колькасць інфармацыі, але вам не трэба ламаць галаву, чым заняць малога.

**Вы заўважылі, як змяніліся дзіцячыя перадачы? Нават мульцікі ненавязліва знаёмяць дзяцей з геаграфіяй, гісторыяй, біялогіяй, матэматыкай, тэхнікай і гэтак далей.**

Толькі пашукайце (у кнігарнях, магазінах з дзіцячымі гульнямі, у інтэрнэце) — і знойдзеце шмат цікавых рэчаў, якія скіраваны на развіццё логікі, увагі, памяці, фантазіі, хуткасці рэакцыі, ужо маўчу пра розныя прописі, штрыхоўкі і азбукі.

Не забываюць бацькі і пра псіхалагічныя заняткі, прычым гэта ўжо не толькі работа з праблемамі малых, а навучанне дзяцей, як распазнаваць эмоцыі, паводзіць сябе ў розных сітуацыях і ўзаемадзейнічаць з іншымі. Падавацца такое выхаванне можа праз казкі, апавяданні, спецыялізаваныя кніжкі, а таксама праз новыя цацкі і праграмы, напрыклад, казкатэрапію, арт- ці музычную тэрапію, sandplay (гульні з пяском) ці псіхалагічны тэатр. У будучым гэтыя веды спатрэбяцца нашым дзецям, калі дарослымі яны будуць працаваць у камандзе ці шукаць шляхі ўздзеяння на кліентаў.

### ШКОЛА ДА ШКОЛЫ?

На жаль, сёння для многіх бацькоў ранняе развіццё — гэта план дзеянняў па навучанні дзіцяці чытанню і ліку. Пры гэтым некаторыя яшчэ і шукаюць такія цэнтры, дзе малых гэтаму будуць вучыць з трох (і нават раней) гадоў. І дарэмна! Часта ў школах ранняга развіцця дзецям даюць усё тое, што малыя праходзяць у дзіцячым садку. Не вядзіце дзетак туды, дзе ці не з пялюшак прымушаюць выводзіць палачкі, кручкі ці літаркі. Маляванне, лепка, мазаіка не горш развіваюць (ці, калі вам больш падабаецца, рыхтуюць руку да пісьма). Літары дзіця можа лёгка запомніць, калі вы знойдзеце адпаведныя настольныя гульні, лічбы засвоіць у маляванні ці аплікацыях па нумарах. Нават задачкі можна рашаць, калі разам гуляеце ў спартыўныя гульні. Няхай дзіця лічыць, колькасць галоў (а колькі трэба яшчэ забіць, каб было дзесяць?) ці збітыя кеглі (а колькі было ці засталося стаяць?), скачкоў (колькі іх трэба, каб даскакаць да лаўкі?).

У сваім захапленні ідэяй ранняга развіцця важна, каб мы не пазбавілі сыноў і дачок звычайных дзіцячых забаў, ім патрэбны час на гульні з разнастайнымі цацкамі, на сустрэчы з сябрамі.

Мы часта аддаём малых на заняткі па падрыхтоўцы да школы, а часу, напрыклад, на мастацкія ці спартыўныя гурткі (а сёння іх таксама вялікі выбар) не хапае. Завітайце ў фізкультурна-спартыўныя цэнтры, ЖЭСы ці цэнтры дадатковай адукацыі. Для дашкольнікаў тут шмат цікавых заняткаў, а карысці ад іх не менш. Яны таксама развіваюць уменне слухаць, разважаць, запамінаць, канцэнтравацца, дзейнічаць па ўзоры — усе тыя навыкі, якія так

**У сваім захапленні ідэяй ранняга развіцця важна, каб мы не пазбавілі сыноў і дачок звычайных дзіцячых забаў, ім патрэбны час на гульні з разнастайнымі цацкамі, на сустрэчы з сябрамі.**

спатрэбяцца будучаму школьніку. Ды і на базе школ часта працуюць танцавальныя, спартыўныя і іншыя гурткі для хлопчыкаў і дзяўчынак 3—5-гадовага ўзросту.

Не трэба забывацца, што дзіця развіваецца і ў выніку ўзаемадзеяння з бацькамі. Сумесныя гульні, паходы ў музеі, тэатры, падарожжы і нават прагулкі па парку могуць шмат даць. Калі ўсе выхадныя дзіця наведвае нейкія заняткі, ці застаецца ў вас з ім час на нешта агульнае? Ці не страчваецца аўтарытэт бацькоў? Ці зможа малое ў адказ на пахвалу з гонарам адказаць: «Гэта мяне мама навучыла!». Што, пасталеўшы, раскажа пра сваё маленства? Ці ўспомніць, напрыклад, як з татам гулялі ў футбол, а з мамай стварылі святочныя ўпрыгажэнні? Падумайце пра гэта, перш чым нагружаць дзіця шматлікімі гурткамі і секцыямі...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# СТВАРАЕМ РАЗАМ З «ЗОРКАЙ»

Нават калі ў сям'і невялікі дастатак, умеючы абыходзіцца з іголкай, можна стварыць рэчы, у якіх будзеш выдзяляцца з натоўпу, — упэўнена **кіраўнік сталічнай «Школы моды і стылю» Цэнтра тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі «Зорка» Алеся КОЛАС.** — Так, старую вопратку можна пафарбаваць або з дапамогай друку нанесці цікавыя прынты, ці ўпрыгожыць вышыўкай, аплікацыяй, у рэшце рэшт, выкарыстаць для іншых вырабаў. Знойдзецца прымяненне старому паліто ці берэту, сумцы, джынсавай вопратцы. Не паляніцеся зразаць гузікі і спражкі, распускаць старыя ўборы, што ўжо пацёрліся, і выкарыстоўвайце фурнітуру. Матэрыялы для будучых вырабаў сустрэнеце і ў інтэрнэце — людзі могуць аддаваць іх танна ці нават бясплатна.



Алеся прапанавала чытачам «Звязды» зрабіць брошку ці завушніцы. Вам спатрэбяцца: скура (ці яе замяняльнік) або фетр (калі ён тонкі і мяккі, бяром некалькі пластоў, паміж імі кладзём кардонку) для асновы, бісер — каб абшыць выраб па контуры ў тэхніцы «амерыканскі шывок», яго памер залежыць ад таўшчыні загатоўкі. У сярэдзіне размяшчаем прышыўныя стразы (яны могуць быць з пластыку або шкла) ці прыгожыя гузікі. А таксама для нашых упрыгажэнняў спатрэбяцца бусіны і стразы ў цапах. Добра, калі вы падбераце дэталі з гранямі — выраб будзе зіхацець. Не паскупіцеся на бісер — напрыклад, з бусін з напыленнем фарба злазіць, прайграе ваша праца і ў выпадку, калі бісер не адкалібраваны. Лепш скарыстацца лёскай альбо падбіраць белыя ніткі, калі вы працуеце з празрыстым бісерам.

Спачатку зрабіце выкладку і вызначце, якога памеру будзе аснова ўпрыгажэння (дыяметр вырабу роўны памеру цэнтральнага страза і дзвюм самым вялікім бусінам, што знаходзяцца вакол яго). Спачатку шаблон намалюйце на паперы, а пасля перанясіце на фетр (скуру). Цэнтральныя стразы (яны размяшчаюцца з двух бакоў) і бусіны трэба «прайсці» іголкай па два разы — тады яны будуць лепш трымацца.

Можаце па-рознаму выкарыстоўваць такое ўпрыгажэнне. Калі хочаце зрабіць з яго падвеску, падыдуць віскозныя, сінтэтычныя шнуры ці ланцужкі, а звычайная сашчэпка дапаможа замацаваць выраб на ёлцы.

**Падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ВЫПРАБАВАННЕ... ГІПЕРАКТЫЎНАСЦЮ

**Яно ўвесь час у руху. Яно «дастала» ўсіх. Яно невыноснае! Вы бачылі такіх дзяцей? Мяркуеце, яны дрэнна выхаваны? На самай справе, гэта асаблівыя дзеці — з сіндромам дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасцю. Як справіцца з такімі «вечнымі рухавікамі» і ўсадзіць іх за ўрокі, што рабіць, каб з часам праявы сіндрому зніклі і ці мае гэты дыягназ наступствы ў дарослым жыцці, расказала псіхолаг Гарадскога дзіцячага клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Галіна СТАНЧЫК.**

## Дыягназ ці складаны характар?

***— Галіна Антонаўна, здаецца, што прыкметы гіперактыўнасці можна знайсці ледзь не ў кожнага дзіцяці...***

— Так, асабліва ў пэўным стане, напрыклад, стомленасці. Увогуле, гэта цяпер «модны» дыягназ. На прыёме часта бацькі з гонарам кажуць, што дзіця гіперактыўнае, але на самай справе ў яго няма гэтага дыягназу, і яны не сутыкаюцца з праблемамі, якія ён цягне. Калі дзіця сапраўды гіперактыўнае, бацькі імкнуцца гэта змякчыць, запэўніваюць сябе, што яно павінна быць актыўным, не спяшаюццаісці да спецыялістаў. І часта звяртаюцца да іх толькі пад уплывам нейкіх абставін. Гіперактыўнасць, як правіла, стварае складанасці ў адаптацыі, асабліва ў школе, ды і ў дзіцячым садку, у гуртках, увогуле ў любой дзейнасці, якая не выклікае цікавасці.

***— Якія прыкметы гіперактыўнасці?***

— Гэты дыягназ уключаны ў міжнародную класіфікацыю захворванняў і носіць назву сіндром дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю. Такое дзіця вельмі прыкметнае. Яно рэактыўнае, імпульсіўнае, не ўмее чакаць, не ўмее канцэнтравацца. Для пастаноўкі дыягназу павінна спалучацца некалькі прыкмет, у адкрытым доступе ёсць адпаведныя анкеты. Але паколькі гэта праяўляецца вельмі індывідуальна, лепш кансультавацца са спецыялістам, каб зразумець: гэта дыягназ, асаблівасці тэмпераменту або наступствы стрэсу ці частых хвароб. Сіндром дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю сустракаецца ў трох варыянтах: часцей за ўсё дэфіцыт увагі і гіперактыўнасць спалучаюцца, але бываюць і паасобку.

***— Здаецца, што такія дзеці крыху агрэсіўныя...***

— Трэба разумець, што гэта не агрэсія. Такіх дзетак часта параўноўваюць з аўтамабілем, у якога перасталі дзейнічаць тармазы. Яны рэактыўныя і імпульсіўныя, і, калі ёсць нейкі раздражняльнік, пачаўшы гульню, якую-небудзь жартаўлівую валтузню, на эмацыянальным узбуджэнні ім цяжка спыніцца. Да таго ж, у іх праблема з прагназаваннем — яны не ведаюць, якія будуць наступствы. Дзеці з ярка выражанай імпульсіўнасцю неасцярожныя, ужо ў дашкольным узросце часта траўміруюцца і апякаюцца, перакулююць на сябе кубкі ці талеркі. Бацькам з такімі дзецьмі расслабіцца не атрымліваецца.

***— У якім узросце звычайна ставіцца такі дыягназ?***

— Усё залежыць ад формы захворвання, часцей яно праяўляецца ў школе. Там адразу становіцца відавочнай няўседлівасць, дэфіцыт увагі, але часам у яркай форме гэта бачна яшчэ ў дашкольным узросце, калі выхавальніцы ў садку з цяжкасцю спраўляюцца з дзіцем. На гэта ёсць і неўралагічныя прычыны, бо часта маюцца адпаведныя спадарожныя дыягназы. У такіх дзяцей сустракаюцца, напрыклад, парушэнні мовы. Па структуры яна можа быць добра развіта, але дзіця вельмі хутка размаўляе, і ў сувязі з гэтым парушана маўленне. Мова можа і адсутнічаць нейкі час, але ёсць гукі. Дарэчы, калі ў гіперактыўнага дзіцяці адсутнічае мова, яно можа здавацца агрэсіўным, бо шукае іншыя спосабы прыцягнуць да сябе ўвагу. Часта бываюць цікі, заіканні, энурэз. У такім выпадку дыягназ праяўляецца раней. Калі ж гэтых прыкмет няма, то ў школе ці папулярных сёння развіццёвых цэнтрах, у спартыўных секцыях ці танцавальных гуртках.

## Як выхоўваць непаседу?

***— Як сябе павінны паводзіць бацькі?***

— Ім часта даводзіцца чуць, што іх дзеці нявыхаваныя, бо збоку гэта выглядае менавіта так, і бацькам вельмі складана. Важна вучыцца правільна рэагаваць на заўвагі навакольных і педагогаў. Дзіця трэба абараняць і самому не прымаць заўвагі сур'ёзна. І што вельмі няпроста — не раздражняцца пры гэтым на дзіця. Трэба разумець, што яно пакуль не можа з сабой справіцца. І не ад таго, што дзіця не хоча, ад таго, што яно не ў стане, і гэтыя паняцці варта раздзяляць. Такі дыягназ не знікне за дзень, гэта надоўга. Выспяванне нервовай сістэмы ў кагосьці адбываецца раней, у кагосьці пазней, але ў любым выпадку — не хутка.

**«Варта яму растлумачваць: што будзе, калі ты нешта не зробіш. Паціху, маруднымі крокамі, але дзіця навучыцца бачыць наступствы сваіх дзеянняў».**

Часта бацькі баяцца ісці па сваё дзіця ў школу ці дзіцячы садок, бо іх абступаюць іншыя дзеці і пачынаюць расказваць, што іх нашчадак нарабіў. Важна спыняць гэта ў жартаўлівай форме, бо калі іншыя малыя адчуюць, што бацькі на дзіця разззлаваліся, гэта будзе прагрэсаваць зноў і зноў. Педагогам з такімі дзецьмі няпроста, і сваю незадаволенасць яны будуць таксама выказваць. З настаўнікамі бацькам важна супрацоўнічаць, прыслухоўвацца да іх рэкамендацый, але пры гэтым прасіць пачынаць з таго, што было добрага, бо такія дзеці лепш рэагуюць на пазітыў. Заўвагі выслухоўвайце, але разбірайцеся з імі пасля.

***— На што ў выхаванні такіх дзяцей павінны звярнуць увагу бацькі?***

— Тыя агульныя рэкамендацыі, якія даюцца ўсім бацькам, у гэтым выпадку проста жыццёва неабходна выконваць. Бо на тых купінах, якія іншыя дзеці паспяхова пераадолеюць, гэтыя малыя могуць спатыкнуцца. Карысна прытрымлівацца звыклых нормаў і традыцый, што ёсць у сям'і. Добра дапамагае рэжым дня, як бы сумна гэта ні гучала: прынялі ванну і кладземся ў ложак. Насамрэч такіх дзяцей вельмі складана ўкласці спаць. Па іх не бачна стомленасці — здаецца, дзіця носіцца і сіл у яго шмат, а на самай справе яно ўжо вельмі стамілася. Прытармазіць самастойна яно не можа, варта паціху рыхтаваць яго да сну і ўкладваць своечасова.

**«Такое дзіця вельмі прыкметнае. Яно рэактыўнае, імпульсіўнае, не ўмее чакаць, не ўмее канцэнтравацца».**



Для сем'яў з гіперактыўнымі дзецьмі школа — той этап, які няпроста прайсці. Што датычыцца дамашніх заданняў, за самастойную падрыхтоўку якіх звычайна выступаюць і псіхолагі, і педагогі, то гіперактыўныя дзеці на працягу пэўнага часу з гэтым не спраўляюцца. Долі галаўнога мозга, якія адказваюць за самакантроль, не дастаткова развіты, у іх праблемы з увагай, яны хутка стамляюцца, таму функцыі кантролю бяруць на сябе бацькі. На пэўным этапе, каб дзіця канцэнтравалася, важна сядзець з ім побач, дзеці нават самі просяць: мама, ты толькі нікуды не сыходзь. І пакуль знешні стымул прысутнічае, малы робіць урокі, як толькі мама адышла, ён і сам не заўважыў, як займаецца чымсьці іншым.

Правільна павінна быць арганізавана і знешняя прастора: важна, каб нічога не адцягвала ўвагу. Калі робім заданне па нейкім прадмеце, значыць на стале ляжыць толькі адзін падручнік і сшытак. Вельмі неабходныя перапынкі, бо імпульсіўныя дзеці хутка спустошваюцца. У школе такім дзецям рэкамендуюць, напрыклад, раздаць сшыткі ці падысці да дошкі, вопытныя педагогі гэта ведаюць. Дома таксама: зрабілі адно заданне — пайшлі папіць сок, прыступілі да наступнага. Кожнаму дзіцяці важна падабраць свой рытм, бо ў іх бываюць моманты, калі зусім зніжана працаздольнасць, яны не могуць сабрацца, тады ім варта даць расслабіцца і адпачыць. Сталеючы, дзеці вучацца гэтаму самі.

Вельмі важна такому дзіцяці захаваць самаацэнку. Зразумела, што яму часта робяць заўвагі, ім бываюць незадаволены — спачатку дарослыя, а потым і аднагодкі. Гіперактыўныя дзеці вельмі добразычлівыя, яны хочуць кантактаваць, але ў іх не атрымліваецца прытрымлівацца правілаў, падстройвацца пад іх. Бывае, што равеснікі не хочуць прымаць іх у гульню, і дзіця гэта вельмі расстройвае. Задача бацькоў — вучыць гуляць, кантактаваць і таксама падтрымліваць самаацэнку: «Так, ты актыўны, але пакуль не можаш удзельнічаць у гэтай гульні». Ні ў якім разе бацькам не трэба вымаўляць вядомае «ды табе толькі ў дворнікі» — такое доўгатэрміновае прагназаванне толькі шкодзіць.

Тым часам карысна вучыць дзіця: «Калі ты сёння не пакладзеш у партфель падручнік, то заўтра не зможаш займацца, і табе паставяць дрэнную адзнаку». Гэта сапраўды дзейнічае, бо часам малое проста не думае пра гэта. Варта яму растлумачваць: што будзе, калі ты нешта не зробіш. Паціху, маруднымі крокамі, але дзіця навучыцца бачыць наступствы сваіх дзеянняў.

Яшчэ варта вучыць разбіваць работу на этапы і паступова яе выконваць. Такім дзецям нельга даваць разгорнутыя заданні, яны іх не ўспрымаюць. Калі сказаць: «Збяры партфель», яно нават і не пачне, бо для яго гэта складана і незразумела. Трэба казаць: вазьмі падручнік матэматыкі і пакладзі ў партфель. Тут важна цярпенне. Увогуле для бацькоў гэта шанц уключыцца ў дзяцінства і пагуляць. Для такіх дзяцей карысныя розныя гульні на ўвагу. Напрыклад, хаваем дома нейкі сюрпрыз, а каб яго знайсці, малюем план ці кажам на словах: два крокі наперад, тры направа. У выніку поспеху павінна быць і ўзнагарода.

Самім бацькам патрэбна захоўваць цярпенне і, канешне, клапаціцца пра сябе. На пэўным этапе, як паказвае вопыт, большасць татаў актыўна ўключаецца ў працэс выхавання, бо адна мама не спраўляецца. Варта адпачываць і не саромецца прасіць дапамогу ў блізкіх. Добра, калі ёсць сярод знаёмых сям'я з гіперактыўным дзіцем старэйшага ўзросту, можна ўбачыць, як яно з часам пераадолела большасць праблем. Ёсць форумы — гэта таксама падтрымка для бацькоў, хоць там важна фільтраваць інфармацыю.

## Прагноз на будучыню

***— З узростам большасць праяў гіперактыўнасці знікае?***

— Бывае па-рознаму, у дарослых таксама сустракаецца дыягназ «сіндром дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю». А здараецца, што ў падлеткавым узросце ён ужо амаль непрыкметны, асабліва калі актыўна выкарыстоўваліся карэкцыйныя метады. Дарэчы, наконт узнікнення сіндрому ёсць некалькі тэорый. Адна з іх — паляўнічага і збіральніка. Дык вось гіперактыўныя людзі — гэта тыя самыя паляўнічыя, якія былі эвалюцыйна неабходны, каб хутка рэагаваць на здабычу. Ёсць версія, што такі сіндром мелі некаторыя знакамітыя людзі, у прыватнасці Леанарда да Вінчы. Зразумела, што ніхто яго ў той час не дыягнаставаў, але можна меркаваць, што сярод вядомых людзей былі гіперактыўныя, бо ў іх ёсць перадумовы выпучацца. Напрыклад, такі дыягназ у дзевяцігадовым узросце быў пастаўлены шматразоваму алімпійскаму чэмпіёну па плаванні Майклу Фэлпсу. Ёсць і генетычныя фактары гэтага сіндрому, і на прыёме таты часам прызнаюцца, што самі былі такімі ж, як цяпер сын. І часта, дарэчы, гэтыя таты станавіліся вельмі паспяховымі ў жыцці.

Камп'ютары — вялікая небяспека для такіх дзяцей. Бацькам часам зручна, калі дзіця гуляе ў тэлефоне ці камп'ютары — можна, нарэшце, адпачыць. Але трэба памятаць, што ў такіх дзяцей вялікая рызыка камп'ютарнай залежнасці. Гэта тая дзейнасць, дзе яны паспяховыя. Там яркія малюнкі, і рэальны свет здаецца менш цікавым. Нельга ім дазваляць «завісаць» у камп'ютары.

***— Чым карысным, дарэчы, можна заахвоціць гіперактыўнае дзіця?***

— Сапраўды, важна дапамагчы знайсці такое месца, дзе дзіця будзе паспяховым. Добра прыжываюцца такія дзеці ў фальклорных калектывах — там разнастайнасць дзейнасці, усё вельмі ярка, ім там камфортна. Часам у тэатральных студыях, на брэйк-дансе, усходніх адзінаборствах. Многае залежыць ад кіраўніка гуртка і трэнера. Важна ўсведамляць, што такія дзеці няроўна займаюцца: сёння ён можа «выстраліць», а заўтра — зусім дрэнны вынік.

***— Гіперактыўнасць мае сур'ёзныя наступствы?***

— Гэта вельмі распаўсюджаны дыягназ, амаль у кожным класе ёсць такое дзіця, часам і не адно. Дарэчы, такім дзецям надомнае навучанне зусім не паказана, бо толькі ў калектыве яны могуць сацыялізавацца і навучыцца сябе кантраляваць. Гэта дзеці, як правіла, з нармальным інтэлектам і вучацца ў звычайным класе. Ніякіх сур'ёзных наступстваў такі дыягназ не цягне, асабліва калі своечасова звярнуцца да спецыялістаў і выконваць іх рэкамендацыі. Ён не абмяжоўвае атрыманне вышэйшай адукацыі, правоў кіроўцы. Таму не трэба баяцца ісці да псіхолага ці псіхатэрапеўта. Калі вам адзін спецыяліст не падыходзіць, пашукайце іншага.

Гіперактыўныя дзеці эмацыянальна цёплыя і надзвычай абаяльныя. Многія псіхолагі з задавальненнем з імі працуюць. Гэтыя дзеці адклікаюцца на любую ініцыятыву і хутка ўключаюцца ў яе. Яны шмат радасці могуць прынесці, калі ў бацькоў ёсць правільны настрой. Толькі чакаць, што гэта будзе ціхае паслухмянае дзіця, ісці да ўрача ці псіхолага з надзеяй, што вам з яго зробяць цацу, не варта. Але чым раней бацькі пачнуць прымаць меры, каб згладзіць праявы сіндрому, тым лягчэй будзе пасля.

Самае важнае для гіперактыўных дзяцей — бацькоўская любоў, падтрымка і цярпенне. А жыццё сям'і з такім цудоўным, хай і нязручным, дзіцем можа стаць яркім, нечаканым і вельмі цікавым.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШЛЮБ ДАЎЖЫНЁЮ Ў 70 ГАДОЎ

— Пойдзем, мая прыгажуня! — пяшчотна звярнуўся Рыгор Сяргеевіч Шабацька да сваёй жонкі Тацціяны Мацвееўны, калі мы папрасілі сямейную пару перайсці ў другі пакой, каб сфатаграфаваць юбіляраў сярод вышытых падушак.

Тацціяна Мацвееўна толькі крыху ўсміхнулася ў адказ на камплімент. А Рыгор Сяргеевіч падаў ёй руку, як галантны кавалер, лёгка і бадзёра. «Мы з табой, мая прыгажуня, яшчэ і станцуем на наша вяселле — 70 гадоў разам, а мне цябе цалаваць хочацца!..»

Сапраўды, такога важкага юбілею сумеснага жыцця не прыпомню. Вялі-і-і-кая рэдкасць не толькі ў вёсцы Выганашчы Івацэвіцкага раёна — у краіне! Нездарма такі шлюб называюць дабрадатным, багатым, блаславёным Богам.



Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.

## Шабацька і... Шабацька

— 12 чэрвеня 1948 года, на Тройцу, у нас у вёсцы гулялі чатыры вяселлі. Наша, Паўла Савуціна, Яўстафія Жука і Мікалая Куратніка. Мы і Павел Рыгоравіч са сваёй жонкай вянчаліся ў Целяханскай царкве. Вянчанне каштавала 300 рублёў. А я бацюшку завёў рыбы, дзень касіў траву вакол царквы, таму ўсяго 100 рублёў заплаціў. Мне выйшла танней, — успамінае Рыгор Сяргеевіч сваё вяселле. — Насілі тады што? Штаны і сарочкі сваёй работы, пафарбаваныя ў алешыну. А на вяселлі я быў апрануты ў ваеннае адзенне, у якім бацька прыйшоў з фронту ў 1946 годзе, — у гімнасцёрцы, галіфэ і ботах. А мая прыгажуня — у спадніцы і кофце ў гарошак, на нагах — чорныя паўбацінкі.

**«Бацька на нас ніколі не крычаў, нават голасу не павышаў, але ўсе мы, дзеці, яго слухаліся, — кажа дачка Марыя. — Працаваць не прымушалі, але мы бачылі прыклад перад сабой і стараліся рабіць так, як бацькі».**

— Якія былі ўборы пасля вайны? Нішчымніца на стале і бядота вакол. Вёска была спаленая ў вайну, — дадае Тацціяна Мацвееўна. — Што на стале было? Мяса, тварог са смятанай, кансервы, кісель, яблыкі цёртыя...

— Як выбіралі сабе жонку? — цікаўлюся ў Рыгора Сяргеевіча.

— У сям'і нашай было пяцёра дзяцей. Калі я пайшоў у першы клас, то ў той жа год пачаў малаціць жыта з дзедам. Вось і выбіраў дзяўчыну, каб работніца была, як я. Хадзіў да адной — гультаяватая, доўга спіць, маці ёй есці варыць, падае, — не падыходзіць. А ў маёй прыгажуні бацька быў працавіты, маці працавітая і дачка такая ж. Грошай тады ніхто не даваў, таму жонку браў, каб азадак голы не быў, каб прала, ткала... Дарэчы, і прозвішча маёй жонцы не давялося мяняць, яна ў дзявоцтве таксама Шабацька.

Жылі маладыя першы час з бацькамі. Дом Тацціяны Мацвееўны быў недалёка, і першы час яна на бліны да сваіх бегала. Не паспелі маладыя намілавацца, як восенню 1948-га забралі Рыгора Сяргеевіча ў так званую працоўную армію — на Украіну ў шахты на тры гады.

— Як забіралі ў армію, калгаса яшчэ не было, а вярнуўся ў 1951 годзе, дык жонка і бацька працавалі ўжо ў калгасе, а дачцэ старэйшай было ўжо больш за два гады, — успамінае Рыгор Сяргеевіч. — Мяне ўзялі працаваць уочтчыкам.

## «Спаборніцтва» з брыгадзірам

Дзівілася, слухаючы Рыгора Сяргеевіча, — такая памяць! Усіх па імені і прозвішчы памятае, даты — не толькі год, а і дзень, і месяц, усе дэталі, падзеі жыцця...

Расказаў Рыгор Сяргеевіч пра выпадак, як ён паспаборнічаў з брыгадзірам.

— Я з касцамі працаваў, а брыгадзір (не буду называць яго прозвішча) з жанкамі жыта ўбіралі. Вечарам абмералі — а ён толькі два гектары зжаў, а трэба яшчэ 15. Яго выклікалі да начальства, і ён папрасіўся памяняцца са мною. Трэба дык трэба. На наступны дзень раніцай ён ужо пайшоў з касцамі, а я — з жанкамі. Але вечарам напярэдадні я абышоў кожную хату і прасіў нават бабулек выйсці жаць, бо нельга ж марудзіць, пакуль надвор'е. Назаўтра выйшлі ўсе: старыя і малыя. Вечарам абмералі — восем гектараў. Жанкі кажуць: калі паабяцаеш барыш, то заўтра скончым талакою. Я пайшоў да старшыні Няхаева і кажу, што заўтра дажынкі будуць. Ён не паверыў, але барыш паабяцаў... Вось ужо на апошнім снапе кветку зрабілі, жанкі сталі ў чаканні барышу песні спяваць, а старшыні з горада няма і няма. Ахрыплі мае дзяўчаты, сонца заходзіць... Ажно едзе Няхаеў. Я яму далажыў, дык ён пайшоў да суседкі, дзе кватараваў, і пазычыў у яе грошай на барыш. Назаўтра мяне выклікаюць і кажуць, каб я займаў месца брыгадзіра. Я сумеўся: ён парцейны, а я — не. І маё сумленне не дазволіла мне заняць яго месца.

## Шчаслівчык

Рыгор Сяргеевіч лічыць сябе шчасліўчыкам не беспадстаўна. У гады Вялікай Айчыннай, калі ён быў яшчэ хлапчуком і пасвіў з сябрам у лесе кароў, здарылася ім аднойчы ўцякаць ад немцаў у балота. Гэта было ў 1943 годзе. Вакол свісталі кулі. Сябра тады забілі, а ён застаўся жывы.

І яшчэ адзін выпадак у жыцці лічыць ён невыпадковым. Калі Рыгору Сяргеевічу было ўжо за 70, ён раптам захварэў. Так моцна, што злёг і развітваўся ўжо з жыццём. Урачы не маглі знайсці прычыну, і сіл у яго не было падняцца з ложка амаль два гады. І неяк ноччу ў роспачы мужчына стаў прасіць Бога, каб забраў яго або падняў, каб не мучыліся блізкія, даглядаючы ляжачага.

А пад раніцу сніцца ці мроіцца, не сказаць: жанчына ў чорным падыходзіць да яго і кажа: «Рыгор, табе яшчэ не пара. Ты не залежвайся, бо будзеш жыць доўга».

Раніцай жонка не паверыла сваім вачам — Рыгор, крыху хістаючыся, падняўся з ложка і даплёўся да канапы. Пасля таго выпадку ён стаў па-сапраўднаму верыць у Бога. Паступова расхадзіўся і да сённяшняга дня на ногі не скардзіцца.

**«І неяк ноччу ў роспачы мужчына стаў прасіць Бога, каб забраў яго або падняў, каб не мучыліся блізкія, даглядаючы ляжачага».**



Першага красавіка Рыгору Сяргеевічу Шабацьку споўнілася 90 гадоў, а ў яго жонкі Тацціяны Мацвееўны такі юбілей будзе ў наступным годзе.

— Хто б мог падумаць, што пасля той хваробы бацька ўстане, — здзіўляецца дачка Марыя. — А ён малайчына, здолеў, і яшчэ сёлета ўсе дровы перапілаваў!

## Сакрэты сямейнага шчасця

— Характарамі падышлі, — кажа гаспадар. — Жонка мяне не надта любіла цалаваць, а я і абдыму яе, і пацалую... Людзі зайздросцілі нам, падцкоўвалі, каб сварыліся, а жонка верыла мне. Яна пайшла на пенсію ў 50 гадоў і яшчэ 22 гады брала ў калгасе дзялку буракоў палоць. Вышывала, ткала, вязала, журавін па два мяхі збірала, прыгажуня мая.

Вядома, не ўсё гладка складвалася ў жыцці. Але Рыгор Сяргеевіч ні з кім не сварыўся. Мо, таму Бог пасылаў яму людзей, якія за яго заступаліся, дапамагалі вырашаць складаныя пытанні, «разрульвалі» сітуацыю. Такім чалавекам, якому назаўсёды ўдзячны Рыгор Сяргеевіч, быў Васіль Сцяпанавіч Шляжка, намеснік старшыні гаспадаркі. Дзякуючы яму Шабацька атрымаў даплату за выслугу гадоў і ў выніку — дастойную пенсію.

**«Хадзіў да адной — гультаяватая, доўга спіць, маці ёй есці варыць, падае, — не падыходзіць. А ў маёй прыгажуні бацька быў працавіты, маці працавітая і дачка такая ж».**

— Бацька на нас ніколі не крычаў, нават голасу не павышаў, але ўсе мы, дзеці, яго слухаліся, — кажа дачка Марыя. — Працаваць не прымушалі, але мы бачылі прыклад перад сабой і стараліся рабіць так, як бацькі. І заўваг тата ў твар не выказваў. Мог маме сказаць: «Марыя ногці нафарбавала, нашто гэта?» А тады мама перадае мне бацькавы словы, і я разумею — не падабаецца яму, значыць не трэба.

— Дзеці харошыя выраслі ў нас, працавітыя, — дадае Рыгор Сяргеевіч. — Марыйка ў мяне ўдалася — пасля ўрокаў бегла да маці дапамагаць бульбу капаць, а пасля бульбы яшчэ ў лес забяжыць ды грыбоў на вячэру збярэ! Наталля вось без мужа ўжо каторы год, нігі баляць, а нам есці наварыць і яшчэ штодзень едзе на веласіпедзе ў другі канец вёскі да дзяцей сына (у яго жонка памерла). Сям'я наша сёння такая: шасцёра дзяцей, 11 унукаў і 13 праўнукаў.

На развітанне Рыгор Сяргеевіч сказаў:

— Усім маладым жадаю, каб кахалі адзін аднаго, паважалі, не пілі гарэлку. Каб беларусы маглі перад іншымі краінамі пахваліцца, што ў нас людзі жывуць не тое што да ста, а нашмат больш гадоў!

Можа, і здарыцца калісьці такі цуд доўгажыхарства.

**Валянціна БОБРЫК.**

# «У размовах з дзецьмі адкрываюцца недзіцячыя ісціны»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Ці думаў я, што аднойчы стану шматдзетным бацькам? Нават уявіць такога не мог. Калі б нехта мне маладому сказаў, што чакае мяне наперадзе, я б дужа спалохаўся і доўга б не жаніўся, — смяецца Павел. — Насамрэч, усё куды прасцей, чым падаецца на першы погляд. Ты ж не адразу на пяцярых адважваешся. Усё адбываецца паступова.

— Дзеці нараджаюцца ад вялікай любові, а не таму што нехта марыць пра вялікую сям'ю, — дадае яго жонка Таццяна.

З Холадамі мы сустракаемся ў парку Дразды, што на ўскрайку Мінска. Тут усе. Тата Павел, які спяшаўся на сустрэчу з офіса Міжнароднай арганізацыі па міграцыі, дзе ён працуе каардынатарам праграм. Мама Таня, што выкраіла гадзінку паміж шматлікімі хатнімі справамі. Падлетак з сур'ёзнымі карымі вачыма — Арсеній. Самы старэйшы з дзяцей (яму 15), нядаўна стаў ліцэістам БДУ. Светлавалосая дзяўчынка — Марта. Толькі ўступіла ў пераходны ўзрост, таму ўсё надзвычай блізка ўспрымае да сэрца. Васьмігадовыя блізняты Вера і Поля падобныя як дзве кроплі вады. Павел прызнаецца, што са спіны нават ён можа іх пераблытаць, асабліва калі яны аднолькава апранутыя. Шумнай Ксеніі яшчэ няма і двух гадкоў, яна не без задавальнення прыцягвае да сябе ўвагу навакольных і адорвае іх усмешкамі.

— З Таняй мы пабраліся шлюбам праз паўгода пасля знаёмства. Мне было 24, ёй — 21. Ніякіх роздумаў наконт адсутнасці ўласнага жылля і не вельмі прыбытковай працы ў нас не было. Пакахалі адно аднаго, пажаніліся і пайшлі дзеці — без ніякіх «але» і «калі». Не збіралі грошы і не чакалі падыходзячых момантаў. Мы кіраваліся прынцыпам — праблемы трэба вырашаць у парадку іх узнікнення. Як ні дзіўна, у нас выхад з любой сітуацыі знаходзіцца сам сабой. Так, у матэрыяльным плане зараз значна лягчэй, чым было, калі ў нас быў толькі адзін Арсеній.

***— Сучасная моладзь спачатку думае пра матэрыяльны дастатак і толькі пасля адважваецца на стварэнне сям'і...***

— Прызнацца, першым часам не ўсе блізкія нас разумелі. Думалі, што мы нараджаем дзяцей, не падумаўшы. Я адзіны сын у сям'і, у Тані толькі адна родная сястра. Але, напэўна, нам наканавана лёсам быць шматдзетнымі бацькамі. Маіх дзядулю і бабулю таксама звалі Павел і Таццяна. І ў іх было... пяцёра дзяцей! Чатыры дачкі і адзін сын. Дарэчы, мы супаставілі факты толькі пасля нараджэння блізнят.



Бацькі...

***— Ганарыцеся статусам «шматдзетнай сям'і»?***

— У нашым доме хапае шматдзетных сем'яў, таму ніякай выключнасці мы не адчуваем, — кажа Таццяна.

— Не люблю ярлык «шматдзетная сям'я». Ні ў якім разе не ганаруся тым, што ў мяне пяцёра дзяцей. Няма ў гэтым нічога занадта асаблівага. У кагосьці двое, трое, восем ці ўвогуле няма. Кожная сям'я — асобны сусвет, які ўпарадкаваны па сваіх правілах. Чалавек павінен ганарыцца не колькасцю дзетак і нават не іх поспехамі, а тым, што ён змог даць ім любоў і шчаслівае дзяцінства. Каб гэты запас светлых пачуццяў застаўся з імі на ўсё жыццё, і яны маглі перадаць яго далей. Па вялікім рахунку дзіцяці, акрамя любові, нічога не трэба, — лічыць Павел.

***— У «Нататках» ёсць эпізоды, дзе вы не прызнаецеся, колькі ў вас дзяцей. Чаму?***

— А навошта казаць, калі не запытваюцца? Адкрыю сакрэт: гэтая інфармацыя ў некаторых людзей выклікае шок. Напрыклад, на пашпартным кантролі памежніцы пастаянна засыпаюць фразамі накшталт: «Ой, колькі іх! Гэта ўсё ўсе вашы? Ад аднаго шлюбу? Як жа вы спраўляецеся, бедненькі?» Прычым жонцы такіх пытанняў не задаюць. А летась у аэрапорце Грэцыі памежнік, прагортваючы штампы ў пашпарце, спачувальна сказаў: «Столькі дачок... Цяжка вам будзе, калі прыйдзе час іх замуж выдаваць!»

***— Як размяжоўваеце хатнія абавязкі?***

— Як мама скажа, так і будзе, — умешваецца ў размову Арсеній і выклікае смех бацькоў.

— Але гэта праўда, — дадае Павел.

***— Ёсць меркаванне, што быццам сыны больш цягнуцца да маtуль, а дочкі да бацькі. Як у вас?***

— Сучасныя дзеці цягнуцца да вайфаю, прычым гэта не залежыць ад полу, — зноў жартуе Арсеній.



...і дзеці

— І не толькі дзеці, — парыруе бацька. — Насамрэч, вайфай — тэма набалелая. У нашым доме ён адключаецца толькі ў крайніх выпадках, калі сітуацыя зусім выходзіць з-пад кантролю.

***— Хто ў сям'і галоўны?***

— Канешне, я! — кажа Павел, і ўсе зноў смяюцца. — Роўна настолькі, наколькі каралева Елізавета кіруе Англіяй. Калі шчыра: чым больш дзяцей, тым большая верагоднасць, што руліць у сям'і будзе жонка. Але гэта не перашкаджае мужу лічыць, што ён галоўны. Усе мужчыны крышачку дзеці, нам важна адчуваць сябе на п'едэстале.

Таццяна з мужам не згаджаецца:

— Ёсць пытанні, якія я магу вырашыць сама. Але і шмат сітуацый, калі апошняе слова дакладна будзе за Паўлам.

***— Павел, а вы строгі бацька?***

— Лічу, што свабода для дзяцей — гэта не так страшна, як залішнія забароны. Прызнаюся, у плане выхавання я далёкі ад ідэалу. Не правяраю дамашнія заданні і не адчытваю за дрэнныя адзнакі. На бацькоўскіх сходах чакаю, каб яны хутчэй скончыліся, у той момант, калі некаторыя бацькі старанна выпісваюць адзнакі з класных журналаў, задаюць пытанні настаўнікам.

Аднойчы сын атрымаў «тройку», і мы разам з гэтага пасмяяліся. Я яго нават з гэтым павіншаваў. А калі ён выдатна здаў уступныя экзамены ў ліцэй БДУ і прайшоў конкурс у шэсць чалавек на месца, я быў вельмі здзіўлены. Не чакаў. Дарэчы, поспехам дзяцей радуешся больш, чым сваім. Асабліва, калі адкрываюцца таленты, якіх у цябе няма. Арсеній — першы фізік у сям'і. У нас гуманітарная дынастыя: адны творчыя асобы.

***— У вас, як у бацькоў з вялікім досведам, ёсць свае сакрэты выхавання?***

— У нашым выпадку дзеці больш выхоўваюць нас, чым мы іх. Наша задача — проста сачыць за парадкам і дысцыплінай. Ніякіх спецыяльных хітрыкаў ці методык, выхаванне адбываецца само па сабе, гэта працэс, закладзены прыродай.

***— Адкуль узяліся «Нататкі шматдзетнага таткі»?***

— Вядома, з жыцця! Але трэба аддаць належнае сацыяльным сеткам. Без іх усе назіранні маглі б назаўсёды застацца толькі ў маёй галаве. Я рабіў запісы на «Фэйсбуку» і яны хутка сталі папулярнымі — збіралі шмат «падабаек» і каментарыяў. Спачатку мне здавалася, быццам я проста фіксую трапныя выказванні і смешныя сітуацыі. Але ў размовах з дзецьмі часам адкрываюцца зусім недзіцячыя ісціны. Пэўна, гэта і чапляе людзей. Мне пашанцавала: з моманту першага посту ў сацсетцы да серыі кніг пра ўласных дзяцей прайшло ўсяго два з паловай гады. Зараз ёсць жаданне выдаць усе «Нататкі» ў адной кнізе і менавіта на беларускай мове.

***— Многія жанчыны задаюцца пытаннем: «Як заахвоціць мужа да ўдзелу ў выхаванні дзяцей?»***

— Прызнаюся: часам я таксама «адлыньваю» ад сваіх абавязкаў. Прыйдзеш дадому пасля работы і так хочацца пасядзець у «Фэйсбуку» ці паляжаць на канапе. Сітуацыя знаёмая многім, праўда? Але калі дзеці побач, яны абавязкова задумваюць нейкую гульню, уцягваюць у свой кіпіш і тады застацца ўбаку ад іх немагчыма.

* * *

Здаецца, жыццё гэтай сям'і склалася такім чынам, што і пажадаць больш няма чаго. І ўсё ж на развітанне пытаюся ў «шматдзетнага таткі»:

***— Ці шкадуеце аб чым-небудзь?***

— Толькі аб тым, што некалі паддаўся на ўгаворы і дома з'явілася кошка. Калі кватэру разносяць дзеці — гэта нармальна, але калі да іх кампаніі дадаецца гэты пушысты камячок — гэта ўжо перабор.

**Ганна КУРАК. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»**
220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

**ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует вкладчиков об изменении процентной ставки по срочному отзывному банковскому вкладу в долларах США**

С 02.11.2018 по действующим срочным отзывным банковским вкладам **«Классик Отзывный свыше года»** в долларах США, открытым до 01.10.2018, устанавливается процентная ставка в размере 1 % годовых.

*Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.*

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»**

---

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов).

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 100325912


## Извещение о проведении 9 октября 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| «административное помещение» общей площадью 2008,7 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 500/D-708150242; теплосчетчик SKU-01 с инв. № 462014; электросети 200 м, К. Либкнехта, 70, с инв. № 01-169; сети водопровода d100 мм L23 м, К. Либкнехта, 70, с инв. № 01-170; т/сети, К. Либкнехта, 70, с инв. № 01-178 | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 1 443 194,84 | 144 000,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

При заключении договора купли-продажи недвижимого имущества ОАО «Минскремстрой» руководствуется своими имущественными интересами, уставом, локальными нормативными правовыми актами Общества, подходами по распоряжению государственным имуществом согласно Указу Президента Республики Беларусь от 4 июля 2012 г. № 294 «О порядке распоряжения государственным имуществом» и другими нормативными правовыми актами Республики Беларусь.

Торги проводятся 9 октября 2018 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 27.09.2018 по 05.10.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 226-41-14, (017) 200-04-11, (029) 688-61-94 (ОАО «Минскремстрой»)

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 30 октября 2018 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/D-187792** общей площадью **1 463,0 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **административное помещение. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Малайчука, 12-6. **Капитальное строение с инв. № 350/D-187788** общей площадью **16,1 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **административное помещение. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Малайчука, 12-4. **Капитальное строение с инв. № 350/D-187786** общей площадью **16,6 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **административное помещение. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Малайчука, 12-3. **Капитальное строение с инв. № 350/D-187790** общей площадью **585,7 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **административное помещение. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Малайчука, 12-5. **Капитальное строение с инв. № 350/D-2387** общей площадью **333,3 кв. м,** назначение – помещение, не относящееся к жилищному фонду, наименование – **помещение банка. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Малайчука, 12.<br>**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000001000262,** общая площадь – **0,0986 га (право постоянного пользования, доля в праве 16/25). Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного-хозяйственного здания.<br>**В состав лота входит:** Ель 10 см (инв. № 7222), Ель 13 см (инв. № 7223), Ель 18 см (инв. № 7224), Ель 23 см (инв. № 7225), Ель 36 см (инв. № 7226), Контейнер для мусора № 4066, Конференцстол № 7093, Кресло руководителя № 7228, Кухня № 7098, Стеллаж металлический, 8 шт. № 7006, Стенд информационный с рамками 368-158см (уличный) № 7238, Стол в приемную № 7094, Стол журнальный № 7101, Стол руководителя, инв. № 7092, Тумба в приемную № 7095, Холодильник МХ-2823-80 КШ-260/30 № 4048, Часы электронные ЧКЭН-02 № 7273, Шкаф для документов № 7096, Шкаф для кулера № 7097, Шкаф-купе № 1 № 7099, Шкаф-купе № 2 № 7100, Акустическая система INTER-M CS-730 № 7054, Алкометр Lion Alcoblow № 7269, Весы ВЛР-200 № 4017, Динамометр /наука/ ДПУ-1-2 № 5056, Измеритель прочности бетона /наука/ ПОС-30 МГ4 № 5059, Кабельная сеть ЛВС № 7010, Камера пропарочная /наука/ универсальная КПУ с пультом управления № 5072, Кондиционер HAIER № 4030, Кондиционер Hyundai HSH-P121NDC № 7287, Кондиционер Samsung AQ12TSBN № 7275, Кондиционер GENERAL ASH9RSJCW № 7134, Кондиционер FUJITSU ASY9RSE-W № 7046, Кондиционер GENERAL ASH12RSJCW № 7047, Кондиционер FUJITSU ASY9RSE-W № 7051, Кондиционер GENERAL ASH7RSCCW № 7140, Кондиционер GENERAL ASH7RSCCW № 7048, Кондиционер FUJITSU ASY9RSE-W № 7049, Кондиционер FUJITSU ASY9RSE-W № 7141, Кондиционер GENERAL ASH12RSJCW № 7050, Кондиционер FUJITSU ASY9RSE-W № 7131, Кондиционер FUJITSU ASY12RSJCW № 7133, Кондиционер GENERAL ASH9RSJCW № 7132, Кондиционер GENERAL ASG18UBBN № 7148, Кондиционер GENERAL ABG24RBA-W № 4086, Кондиционер GENERAL ASH9RSJCW № 00007079, Кондиционер GENERAL ASH7RSCCW № 00007080, Кондиционер GENERAL ASH12RSJCW № 7086, Кондиционер GENERAL ASH9RSJCW № 7108, Кондиционер GENERAL ASH7RSCCW № 7091, Кондиционер GENERAL ASH7RSCCW № 7111, Кондиционер GENERAL ASH9RSJCW № 7107, Кондиционер GENERAL ASH9RSJCW № 7087, Кондиционер FUJITSU ASY9RSE-W № 7088, Кондиционер FUJITSU ASY7RSCCW № 7089, Кондиционер FUJITSU ASY9RSE-W № 7090, Кондиционер FUJITSU ASY9RSE-W № 7109, Кондиционер FUJITSU ASY9RSE-W № 7110, Машина для испытаний на сжатие МС-500 № 4006, Морозильник М-131 № 4023, Оборудование для снятия мягкой кровли № 7069, Охранная сигнализация № 4034, Охранно-пожарная сигнализация № 4075, Пресс ВМ /наука/ 1000КН, ВМ 3.5 № 5064, Прибор для измерения освещенности (ТКА-ПКМ 31) № 7276, Психрометр МВ-34М № 7180, Регулятор тепла ЭСКО-РТ № 00007081, Рейка универсальная складная «Кондор» № 7114, pH-метр /наука/ HANNA HI8314 № 5058, Система пожарной сигнализации и оповещения № 7241, Измеритель защитного слоя бетона ИПА-МГ4 № 4067, Теодолит АШТ № 7011, Узел учета тепловой энергии на отопление ТЭМ-104 № 7067, Электронный измеритель плотности тепловых потоков ИТП-МГ4.03./3 (I) Поток № 7274, Калькулятор CITIZEN SDC-660II № 7290, Калькулятор CITIZEN SDC-660II № 7292, Калькулятор CITIZEN SDC-888TII № 7293, Калькулятор CITIZEN SDC-888 № 7294, Калькулятор CITIZEN SDC-760 № 7295, Калькулятор CITIZEN SDC-435II 7296, Калькулятор CITIZEN SDC-435II № 7297, Видеокамера передающая № 4072, Видеомагнитофон № 4046, Камера CCTV EVC-C 210 VP № 7265, Камера CCTV EVC-C 210 VP № 7266, Камера Nikon Coolpix 3100 № 4070, Микрофоны к акустической системе INTER-M CS-730, Genius 2 шт., INTER-M 5 шт. № 7055, Мини АТС NX-1232 HIBRID KEY SYSTEM № 4073, Музыкальный центр Panasonic SA-AK300 № 4045, система видеонаблюдения № 7113, Система контроля доступа 6-й этаж № 7240, Система контроля пропуска № 7208, Телефакс PANASONIC KX-FT984RU № 7071, Телефакс PANASONIC KX-FT982RU № 7073, Телефакс PANASONIC KX-FT934RU № 7070, Телефакс PANASONIC KX-FT982RU № 7072, Телефон-факс /наука/ PANASONIC KX-FL543 № 5052, Компьютер /наука/ Сильверадо 2000 № 5014, Компьютер /наука/ ноутбук HP Compaq nx8220 (PY544EA) № 5051, Компьютер FINIST 0499-А 64X24600 № 7153, Компьютер «Айвен» 3200 № 7122, Компьютер «Айвен» 3200 с монитором LG1730s 17» № 7082, Компьютер «Айвен» 3200 с монитором Samsung 720N 17» и клавиатурой № 7112, Компьютер «Айвен» 3200 № 7119, Компьютер «Айвен» 3200 № 7123, Компьютер «Плаза» АМД Ation с клавиатурой, инв. № 7234, Компьютер «Плаза» АМД Atnion 64x2 5000 № 7231, Компьютер «Плаза» АМД Athion № 7233, Компьютер /наука/ Сильверадо 2000 № 5006, Компьютер /наука/ Сильверадо 2000 с монитором LG 17» с клавиатурой и мышкой № 5008, Компьютер /наука/ Сильверадо 2000 с монитором LG1730s 17» № 5012, Компьютер /наука/ Сильверадо 2000 с монитором Philips 17» № 5015, Компьютер /наука/ Сильверадо 2000 № 5021, Компьютер /наука/ Сильверадо 2000 № 5023, Компьютер /наука/ Сильверадо 2000 № 5025, Компьютер /наука/ Сильверадо 2000 № 5032, Компьютер Athlon № 7282, Компьютер Athlon № 7283, Компьютер Finist 0499-А 64X24450E с монитором LG 17» с клавиатурой и мышкой № 7161, Компьютер Finist 0499-А 64*24450E № 7155, Компьютер Prestigio 1299-1600 с монитором № 7230, Компьютер Prestigio 1299-1600 Cejeron № 7210, Компьютер Prestigio 7499- А 64X24450E № 7165, Компьютер Prestigio Селерон 1299-1200 № 7154, Компьютер ПЭВМ «Delta» с монитором Philips 19» № 7251, Компьютер ПЭВМ Rednox с монитором LG19» № 7270, Компьютер Prestigio 1299-3200 № 7239, Компьютер Prestigio 1299-1400 Селерон № 7202, Компьютер с монитором 17» № 7074, Компьютер с монитором Philips 17» № 7042, Компьютер с монитором Philips 17» № 7044, Компьютер Сильверадо 2000 № 5009, Компьютер Сильверадо ПЭВМ ICM C430.G31 svga № 7278, Компьютер Солидейт SL-19 № 7259, Компьютер Солидейт SL-19 № 7260, Компьютер ОНИКС СОРЕ № 7305, Компьютер Селерон 2,0 № 7304, Мобильный ПК HP Compaq 6730s № 7201, Монитор 17» LG FLATRON L1730B № 7159, Монитор 17» Philips 170S № 7104, Портативный компьютер ASUS X5DC Celeron D220 1.2Ghz2048Mb № 7279, Принтер /наука/ Samsung ML-1615 № 5048, Принтер /наука/ HP LaserJet 1020 № 5049, принтер /наука/ Samsung ML-1615 № 5050, Принтер /наука/ HP LaserJet 1160 № 5045, Принтер /наука/ HP Лазер 1160 № 5041, Принтер /наука/ HP LaserJet 1160 № 5043, Принтер /наука/ HP Лазерсет 1160 № 5036, Принтер /наука/ HP LaserJet 1160 № 5038, Принтер /наука/ HP LaserJet 1160 № 5039, Принтер /наука/ HP LaserJet 1160 № 5040, Принтер /наука/ HP LaserJet 1160 № 5044, Принтер /наука/ HP Color LaserJet 2600n № 5035, Принтер лазерный МФУ RICOH Aficio SP100SU № 7302, Принтер лазерный HP Deskjet 3845 № 4068, Принтер лазерный HP Deskjet D1360 № 4069, Принтер HP Photosmart C3100 Series № 4029, Принтер HP LJ 1018 № 7120, Принтер HP LJ 1018 № 7124, Принтер HP LJ 1018 № 7105, Принтер Canon L10576E (LBP-810) № 7043, Принтер Canon i-SENSYS LBP2900 № 7045, Принтер /наука/ Canon i-SENSYS LBP3000 № 5047, Принтер Canon LBP2900 № 7075, Принтер Samsung ML-1615 № 7106, Принтер HP LJ 1018 № 7125, Принтер цветной XEROX Phaser 6130 № 7177, Копировальный аппарат KYOCERA KM-1635 № 7309, Ксерокс KYOCERA KM-1620 № 4080, Копировальный аппарат /наука/ KYOCERA KM-2020 № 5053 | **2 407 681,20** | 120 384,06 | 240 768,12 |
| | **Примечание (лоты №№ 1–7):** земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Информация о земельном участке (лоты №№ 1–7):** кадастровый номер **320850100004000077,** общая площадь – **4,9542 га (право постоянного пользования).**<br>**Местонахождение:** Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, д. 46. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для содержания обслуживания производственной базы | | | |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28067** общей площадью **202,4 кв. м,** назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – **бытовка. Капитальное строение с инв. № 311/С-28434** общей площадью **14,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **насосная. Благоустройство внутридворовое** (инв. № 1-355) в т. ч.: асфальтобетонное покрытие: **площадка № 2 – 350,0 кв. м. Электроснабжение (инв. № 1–730**), в т. ч.: АВВГ 3х35+1х16 – **70,0 м** | **58 164,00** | 2 908,20 | 5 816,40 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28436** общей площадью **526,6 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж.** Уборная (туалет возле гаражей), инв. № 1-797 | **42 564,00** | 2 128,20 | 4 256,40 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28429** общей площадью **817,6 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **мехмастерская.** Благоустройство внутридворовое (инв. № 1-355), в т. ч.: **покрытие из бетонных плит – 250,0 кв. м** | **75 564,00** | 3 778,20 | 7 556,40 |
| 5 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28428** общей площадью **254,0 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **мехмастерская.** Электроснабжение (инв. № 1-730), в т. ч.: АВВГ 3х25=1х10 **– 100,0 м** | **20 412,00** | 1 020,60 | 2 041,20 |
| 6 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28064** общей площадью **204,5 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **гараж. Капитальное строение с инв. № 311/С-28437** общей площадью **734,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **склад. Капитальное строение с инв. № 311/С-28430** общей площадью **820,1 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **полигон ЖБИ (эстакада). Капитальное строение с инв. № 311/С-28435** общей площадью **195,8 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **здание РБУ.** Туалет возле склада (инв. № 1-798). Благоустройство внутридворовое (инв. № 1-355), в т. ч.: асфальтобетонное покрытие: **площадка № 3 – 5625,0 кв. м** | **249 432,00** | 12 471,60 | 24 943,20 |
| 7 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-28438** общей площадью **340,3 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **склад** | **28 680,00** | 1 434,00 | 2 868,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости – Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 27 сентября 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 26 октября 2018 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения. Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

# ДЗІВОСНАЕ ПОБАЧ

**Каб зладзіць вандроўку і наталіць прагу ведаў пра нейкі аб'ект, часам не патрабуецца нават транспарт. Дастаткова, адчуўшы напярэдадні ў душы нешта нейкае, здзейсніць паўтысячы крокаў пешкі. Іншымі словамі кажучы — даверыцца сябе інтуіцыі.**


Касцёл Святога Роха.

Я не памятаю, калі даведалася пра існаванне ў нашай слаўнай гісторыі асобы з імем Магдалена па прозвішчы Радзівіл. Так бывае. Калі ўжо напэўна пра некага або нешта ведаеш, то ніколі не можаш сказаць, адкуль тое веданне бярэ свой пачатак. Ведаеш пра гэта як пра сонца і зоркі — ведаеш і ўсё. Магдалену Радзівіл я люблю якраз за сонечнасць і не зорнасць. Здольнасць асвятляць іншым шлях, а самой не блішчэць, не выпячвацца — здольнасць вялікая, уласцівая самым з самых. Я люблю, калі так, паважаю такі парадак.

Значыцца, Магдалена. Я некалі пра яе пісала. Праўда, артыкул прысвячаўся не ёй, а яе свекрыві, Катажыне Радзівіл з Ржавускіх. Мы выдатна ведаем, што іншы герой мінулага часу не варты нават мізэрнай увагі публікі, і цудоўна разумеем, хто ў гісторыі больш каштоўны, хто вялікі, а хто проста ў ёй, так бы мовіць, застаўся — выпадкова або па абсалютна непраўдападобнай прычыне. І тым не менш мы не адмаўляем сабе ў пераключэнні ўвагі на герояў мінулага часу не тое каб менш слаўных, але такіх, чыя слава — іншага кшталту. Наша гісторыя не такая «цнатлівая», як гэта ўяўляецца даволі значнай колькасці суайчыннікаў. Авантурыстаў, прынамсі, хопіць у ёй хоць на сотню аповедаў. Вось і Катажына такой была... Але вернемся да месца вандроўкі.

Нейкі час таму пачало мяне настойліва адольваць жаданне наведаць Залатагорскі касцёл. Той самы, што належыць прыходу Святой Тройцы і носіць імя ў гонар Святога Роха. Той, што ў Мінску на Залатой Горцы. Ад майго месца працы гэта праз скрыжаванне, праз некалькі соцень метраў, таму наведаць яго — справа працягласцю ў абедзенны перапынак. І што? І нічога. Нічога з тым неадчэпным жаданнем я не рабіла, як гэта ні дзіўна. Быццам клікаў мяне гэты храм, а я, ганарліўка, не слухала, не адгукалася. У гэты ж самы час досыць часта прыходзіў да мяне ў думках, выплываючы з памяці аб прачытаным, вобраз Магдалены, яе жыццёвы прыклад і духоўны арыенцір. Мне, ведаеце, падабаецца мець куміраў.

І вось аднаго дня я выпадкова даведваюся, што кумірка мая Магдалена з Завішаў, primo voto Красінская, больш вядомая як Радзівіл, ужо не ў Швейцарыі, дзе была пахавана ў 1945-м, а ў Мінску, у касцёле на Залатой Горцы. Як я прапусціла навіну пра яе перазахаванне, як прайшлі міма мяне ўсе перыпетыі, з гэтай справай звязаныя, — не ведаю. Але важная культурная падзея аказалася прапушчана. Прыкра было яшчэ і з-за таго, што жаданне наведаць касцёл, якое цяпер можна тлумачыць як спробу нябёсаў зладзіць мне кампенсацыю за прапушчанае, цалкам мной ігнаравалася. Бесцырымонна і беспрычынна. Ніякай павагі да інтуіцыі, калі іншымі словамі. Так бывае.



Круг у цэнтры — Сусвет, накладзены на яго крыж — тайна Увасаблення Бога ў чалавека, пяць галубоў на яго фоне — пяць кантынентаў, салідарнасць, адзінства.



Побач Магдалена Радзівіл у вечнасці.

І вось я іду да касцёла Святога Роха. Калі дакладней, то месца, куды я прыйшла сонечным ранкам, — гэта стары некропаль, даўнія каталіцкія магілкі. «На зваяванай і захопленай зямлі, дзе жыццё як падарожжа па чужыне ў смутку і жальбе, толькі камені галосяць і вецер вые па-над магіламі». Словы гэтыя апаясваюць па перыметры бронзавы медальён з выявай анёла, які спрабуе падняць, усталяваць над зямлёю вялікі драўляны крыж. Медальён упраўлены ў каменны мур, на які трэба падняцца па прыступках, каб апынуцца на тэрыторыі, дзе раней былі могілкі, а цяпер (па дарозе да храма) стаяць надмагільныя камяні з надпісамі па-польску. Камяні з магіл XIX стагоддзя. Адкуль гэтыя словы, што апаясваюць медальён? Адзін чалавек даводзіў мне, што Залатагорскі некропаль часткай сваіх пахаванняў быў звязаны з паўстаннем 1863—1864 гадоў. Быццам прывозілі сюды пакараных, каб хаваць. Быццам расказвалі пра гэта па сакрэце старыя людзі. І быццам у архітэктуры храма можна пры жаданні знайсці сімволіку дат паўстання — адразу абедзвюх. Атрымліваецца нейкі «дэн браўн». Пры жаданні, ведаеце, усё можна. Але тут я ні ў якія «коды да вінчы» гуляць не хачу: хапае рэальных дзівосаў на нашай зямлі. Да прыкладу, Залатагорскі касцёл, дзе цяпер пахавана наша дабрачынка Магдалена, і касцёл, побач з якім яна была пахавана ў Фрайбургу, на тэрыторыі манастыра сясцёр-дамініканак, — нечым падобныя, і падабенства такое радуе: побач з тым храмам яна правяла апошнія гады жыцця, а побач з касцёлам Святога Роха перад Першай сусветнай набыла дом № 3 у Могільнікавым завулку — гэта на месцы дома з тым жа нумарам на сучаснай Залатой Горцы. Значыць, была прыхаджанкай гэтага храма, і месца яе пахавання выбрана вельмі правільна.

На шыльдзе, за якой пахаваны прах Магдалены, партрэт-барэльеф яе, маладой. Прыгожая жанчына. Вельмі прыгожая. Яе прыгажосць кшталту тых прыгажосцяў, што не знікаюць з гадамі. Гляджу на партрэт яе сталай, размешчаны побач: відаць, што асоба дзейная, неўтаймоўная, жвавая, з маладою душой, з задорнай прычоскай. Наша жанчына.

Пытаюся ў супрацоўніцы храма, ці ёсць у яго сценах іншыя пахаванні, як гэтае, за шыльдай і з барэльефам. Аказваецца, няма, гэта першае. Заўважаю на супрацьлеглай сцяне не шыльду, але медальён. «Christus heri hodie semper», — чытаю, падышоўшы. «Хрыстос учора, сёння, заўтра». Яшчэ ў 1996 годзе, рыхтуючыся да 2000-годдзя Хрыста, Ватыкан паклапаціўся пра лагатып юбілею. Гэты знак быў прыдуманы італьянскім студэнтам. І тое, што прыдумаў адзін чалавек, разышлося па ўсім свеце. Круг абазначае Сусвет, накладзены на яго крыж — тайну Увасаблення: Бог стаў падобным на людзей. А на фоне крыжа — пяць галубоў. Паасобку яны сімвалізуюць пяць кантынентаў нашай планеты, а разам — салідарнасць, адзінства.

Мне адсюль выходзіць не хочацца. Але час пачынаць працоўны дзень, нічога не зробіш. Выходзячы з храма, затрымліваюся ля таблічкі з пералікам нагод для малітвы. «Вазьміце паперку з нумарам з адной ячэйкі і пакладзіце яе ў другую», — прапануе мне надпіс. Бяру. Выпадае 38 — «за нашых дабрачынцаў». Малюся.

**Падарожнічала Святлана ВОЦІНАВА.**

### Рамантыкам

*Першы муж Магдалены, Людвік Красінскі, быў старэйшы за яе на паўстагоддзя і вельмі заможны. Другі — маладзейшы на дзевятнаццаць гадоў, небагаты. Мікалай Вацлаў Радзівіл быў праўнукам таго Антонія Радзівіла, які напісаў музыку да «Фауста». І сынам Катажыны з Ржавускіх, пляменніцы Караліны Сабаньскай, якой прысвячаў вершы Пушкін. А другая цётка Катажыны была жонкай Бальзака. Пра саму Катажыну Андрэ Маруа пісаў, што ўсё ў яе жыцці было «суцэльнай маной і прыдумкай». Гэткая авантурыстка. Дакладна вядома, што з мужам яна развялася, сынам не вельмі цікавілася, у Германіі строіла падкопы пад Бісмарка, у Расіі «мела нячыстыя справы», у Лондане пазнаёмілася з Сесілам Родсам і стала «апошняй жанчынай брыльянтавага магната». Шмат арыстакратычных дамоў у розных краінах яна ўблытала ў свае авантуры. Нават спрабавала фальсіфікаваць існаванне лістоў удавы Бальзака, быццам бы невядомых. Іншымі словамі, штучка. А сын яе, Мікалай Вацлаў, мог знайсці ў Магдалене, старэйшай за яго на дзевятнаццаць гадоў, не толькі жонку і аднадумку, але і клапатлівую, пяшчотную, добрую, мудрую, сумленную, ахвярную жанчыну — архетып маці. Думаецца, што менавіта так і было.*

### Паслядоўнікам

*Каб дакрануцца яшчэ да гісторыі жыцця Магдалены з Завішаў, primo voto Красінскай, больш вядомай як Радзівіл, варта з'ездзіць у Першамайск, што каля Узды. Там захаваліся рэшткі сядзібы Завішаў — флігелі, млын, гаспадарчыя пабудовы, а таксама былы кальвінскі збор, які потым зрабіўся касцёлам, а пасля ператварыўся ў фамільную крыпту, хоць у наш час ужываецца як склад. Тут, у сядзібе пад назвай Кухцічы (раней называлася Кухціцы і так падае Афтаназы) пасля вянчання ў 1906 годзе ў Лондане і халоднага прыёму лонданскай свецкай публікай (ну яшчэ б — такі мезальянс!) пасяліліся Магдалена і Мікалай Вацлаў. Тут, у крыпце, ён быў пахаваны, загінуўшы ў 1914-м на вайне. Сумеснага жыцця гэтым людзям выпала толькі восем з паловай гадоў.*

## Далёка і блізка



Уявіце сабе маленькі правінцыйны і, што яшчэ істотней, старадаўні італьянскі гарадок. Крывыя вузкія вулкі, магутныя сцены былых фартэцый, невысокія камяніцы, паўсюль кіпарысы і піхты, розныя сукуленты, усмешлівыя бабулечкі і дзядкі... Гарадок Мантэпульчана ў правінцыі Таскана якраз такі. І там якраз праходзіць фестываль рамёстваў: пачынаючыся ў апошнюю пятніцу верасня, ён доўжыцца цэлы тыдзень. Дакладнае месца свята — П'яца Гранда, Вялікая Плошча. Кавалі, ганчары, рэзчыкі па дрэве, ювеліры, каруначнікі... Майстар-класы, кірмашы, выстаўкі... Мітусня...Такая часам жаданая мітусня.

**29 верасня** ў старадаўнім Гродне — такая самая мітусня. Майстар-класы па пляценні з саломкі, вязанні і апрацоўцы тканіны, ганчарстве, кавальскай справе і іншых традыцыйных занятках ранейшых людзей, якім заўсёды было чым заняцца. Ці возьмеце вы нешта за ўзорны занятак, ці пачняце пасля наведвання мерапрыемства гафтаваць або шыць фартушкі? Ці зноў вас пацягне з жыцця ў сацыяльныя сеткі?..

**1 кастрычніка** ў Мірскім замку чакаецца знатнае паляванне ў стылі 1920—1930-х гадоў. Князь Альбрэхт Радзівіл рыхтуецца сустракаць князя Манака, а яго дачка Альжбета ўжо клапоціцца пра добрую гарбату для ўсіх гасцей. І мядзведзя смаргонскага прывядуць: каб можна было з ім сфатаграфавацца на памяць.

**15 кастрычніка** ў аграгарадку Райца Карэліцкага раёна — свята Макошы, багіні-гафтавальшчыцы і бісерапляцельшчыцы. Усім, хто паважае так званы хэнд-мэйд, варта туды завітаць: нешта прадаць, нешта набыць, нечаму павучыцца...



**У другую нядзелю кастрычніка** ў сёлах Арменіі ладзяцца святы ўраджаю. Жыхары накрываюць сталы смакатою, спаборнічаючы між сабой не толькі ў разнастайнасці страў і прадуктаў, але і ў харастве сервіроўкі. Ведаеце, што вам трэба найперш пакаштаваць, калі там апынаецеся? Традыцыйную армянскую ікру, гародніну для якой падпякаюць на кастры — каб страва пахла дымам і святам.

**14 кастрычніка ў Францыі** — свята каштанаў. Не тых звычайных, якія растуць і ў нас, а тых, што называюцца кугурдонамі. Некалі каштаны былі прыстасаваны пад продаж манахамі-бенедыкцінцамі, гэта яшчэ ў XI стагоддзі было. Гатуюць ласунак на вуліцах гарадоў у жароўнях, і пах ідзе ад яго такі, што прамінуць немагчыма. Як немагчыма перадаць яго смак тым, хто не каштаваў, і як немагчыма забыць гэты смак. Пакаштуеце?

■ Мама, пачытай!

# ЧАРОЎНАЯ ПАЛАЧКА

Аднойчы, калі бацькоў не было дома, да мяне завітала сяброўка Маша, якая жыве таксама ў нашым пад'ездзе. Яна вучыцца ў другім класе і малодшая за мяне на тры гады. Але гэта не перашкаджае нам сябраваць.

Мы сядзелі ў маім пакоі і марылі.

— Вось калі б у мяне была чароўная палачка... — пачала фантазіраваць сяброўка.

— То што тады? — запыталася з цікавасцю ў яе.

— Я б папрасіла сабе марожанае, — адказала яна.

— А я б торт, — сказала я.

— А я б шакаладку, — выказала новае жаданне Маша.

— А я — шмат газіроўкі.

— А я, — пачала сяброўка і задумалася. — Я б папрасіла, каб усе думалі, што я ў школе, а на самай справе я была б дома.

— Ведаеш, а чароўныя палачкі на дарозе не валяюцца, — сказала я сяброўцы. — Іх заслужыць трэба.

— Ведаю, — адказала Маша. — Трэба здзейсніць тры добрыя ўчынкі.

— Так. Ты іх здзейсніла? — пацікавілася я.

— Трэба палічыць, — нарэшце, вырашыла яна.

— Давай.

— Раніцай я пачысціла зубы, — стала лічыць Маша. — Гэта раз.

— Пачакай, — спыніла я яе. — Які ж гэта добры ўчынак? Зубы ты чысціла для сябе. Для навакольных няма ніякай карысці ад тваёй справы.

— Добра, — пагадзілася Маша. — Думаеш, я іншага нічога не рабіла? Я, між іншым, сёння сама знайшла свае шкарпэткі. Мама мне не дапамагала.

— І гэта не ўчынак, — сказала я. — Зноў гэта справа ніякай карысці нікому не прынесла.

— Тады... Ведаеш, які я яшчэ добры ўчынак зрабіла? Манный кашы цэлую талерку з'ела. Карысць? Карысць. Нават мама так сказала.

— Для каго карысць? — не пагадзілася я. — Для цябе. Так што не заслужыла ты пакуль ні чароўнай палачкі, ні марожанага, ні шакаладку.

У гэты момант у кватэру зайшла мама.

— А, і Маша тут, — сказала яна. — Вельмі добра. Спусціцеся, калі ласка, у двор. Там бабуля Ніна з кірмашу дзве вялізныя сеткі цягне. Адну я ёй дапамагла данесці да кватэры, а пра іншую сказала, што ты, Насця, дапаможаш. Яна каля пад'езда стаіць, чакае.

Мы хуценька сабраліся і пачалі спускацца ўніз.

— Дзякуй вам, дзяўчаткі, — сказала бабуля, калі мы дапамаглі ёй паднесці сетку. — Трымайце пачастунак!

Бабуля працягнула нам шакаладку. Мы ўзялі яе, падзякавалі і вярнуліся ў кватэру.

— Вось і салодзенькае да гарбаты, — усміхнулася Маша.

— І чароўная палачка для гэтага не спатрэбілася, — заўважыла я. — А ўсё добры ўчынак — удзячнасць за яго ад людзей заўсёды вяртаецца.

Маша на гэта нічога не адказала. Відаць, яна думала пра наступны добры ўчынак, які зробіць пасля.

**Андрэй СІДАРЭЙКА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**П А К А Ш Т У Й Ц Е !**

## РУЛЕЦІКІ З ПЕЧАНАГА ПЕРЦУ

***Спатрэбіцца:*** *1 кг чырвонага перцу (доўгі і вузкі), 500 г сярэднесалёнай брынзы, 1 пучок пятрушкі, некалькі галінак мяты (можна замяніць базілікам), 50 мл аліўкавага алею, соль і перац — на смак.*



Духоўку разагрэць да 180 °С. Перац раскласці на бляху, апырскаць алеем і запякаць у духоўцы да гатоўнасці. Час ад часу перац варта пераварочваць. Для правільнай тэкстуры ён павінен стаць мяккім, а па баках карычневым. Гатовы перац пераласці ў міску альбо цэлафанавы пакет, які варта завязаць, і даць астыць. Гэтая працэдура дазволіць лягчэй ачысціць перац. Астылы перац ачысціць, выдаліць насенне і нарэзаць на доўгія палоскі шырынёй 4-5 см.

Пятрушку і мяту дробна насекчы. Змяшаць з нарэзанай брынзай, алеем і перцам. Старанна расцерці відэльцам. Выкласці на палоскі перцу падрыхтаваную начынку.

Скруціць невялікія рулеты. Па жаданні апырскаць алеем і як след астудзіць.

## КУРЫЦА Ў СЛОІКУ ВА ЎЛАСНЫМ СОКУ

***Спатрэбіцца:*** *курыца (1,2—2 кг), 1 вялікая цыбуліна, соль на смак, перац гарошкам духмяны і чорны, лаўровы ліст, 1 памідор, 1 балгарскі перац.*



Курыцу і гароднiну нарэзаць. Укладваем мяса і гароднiну са спецыямі ў трохлітровы слоік пластамі: пласт мяса, солім яго, дадаём некалькі гарошын перцу, лаўровы ліст, далей — пласт сумесі гароднiны і гэтак далей. Калі курыца вялікая, то слоік атрымаецца практычна поўны. Ніякай вадкасці ў слоік з курыцай дадаваць не трэба! Накрыць слоік новым бляшаным вечкам без гумкі і паставіць яго ў халодную (!!!) духоўку на ніжнюю паліцу (не на дно духоўкі, а на рашотку або эмаліраваную бляху для смажання). Затым разаграваем духоўку да 180 градусаў і забываемся пра яе на 1,5 гадзіны.

У выніку — духмяная курачка са смачнай гароднінай!

**В А Р Т А   В Е Д А Ц Ь**

## ЦУДАДЗЕЙНЫ ЯБЛЫЧНЫ ВОЦАТ

### Супраць болю ў горле

Змяшайце 1/4 шклянкі яблычнага воцату і 1 шклянку цёплай вады. Гэтай сумессю карысна паласкаць горла пры самым нязначным намёку на хваробу — усе шкодныя мікробы ў ротавай поласці будуць знішчаны.

### Супраць пякоткі

1 ч. л. яблычнага воцату з невялікай колькасцю вады дапаможа справіцца з пякоткай. Прыродны заменнік антацыдаў.

### Супраць перхаці

Яблычны воцат умацоўвае валасы, робіць іх пышнымі і бліскучымі. А яшчэ воцат знішчае перхаць! Змяшайце 1/4 шклянкі воцату з 1/4 шклянкі вады, апаласніце гэтай сумессю валасы пасля мыцця. Можна пакідаць воцатны раствор на валасах на працягу 15 хвілін для лепшага эфекту. Перхаць знікне бясследна.

### Супраць сутаргаў

Сутаргі часцей за ўсё сведчаць пра дэфіцыт калію. Змяшайце 2 ст. л. воцату з 1 ч. л. мёду і шклянкай цёплай вады — атрымаецца хатні сродак Супраць сутаргаў, які папаўняе недахоп калію ў арганізме! А яшчэ ў воцаце змяшчаецца магній, жалеза, фосфар, медзь і сера.

### Супраць скурнага свербу

Калі скура непрыемна свярбіць, нанясіце на пашкоджаны ўчастак трохі воцату, выкарыстоўваючы ватны дыск. Супрацьгрыбковыя і антыбактэрыяльныя ўласцівасці натуральнага воцату дапамогуць справіцца з разнастайнымі пашкоджаннямі скуры.

### Супраць бародавак

Вірусныя барадаўкі можна вывесці, наносячы на іх дзень за днём яблычны воцат. Рабіце гэта рэгулярна, і абавязкова заўважыце вынік.

### Супраць паху ног

Робячы ванначку з яблычным воцатам кожны вечар, вы забудзецеся аб такой праблеме, як патлівасць і непрыемны пах ног! Воцат справіцца з грыбком на ступнях дзякуючы сваім антымікробным уласцівасцям.

### Супраць непрыемнага паху ў доме



Развядзіце воцат з вадой і заліце раствор у пульверызатар. Распырскваючы гэтую сумесь па доме, можна гарантавана пазбавіцца ад непрыемных бытавых пахаў.

### Супраць бруду

Пры дапамозе воцату можна выдаліць застарэлы бруд, плямы, цвіль, разводы на сантэхніцы. Гэта шматмэтавы ачышчальнік, які каштуе нашмат танней звычайных хімічных сродкаў.

### Супраць цвілі

Цвіль на плітцы ў ванным пакоі і ўнутры пральнай машынкі — звычайная справа. Воцат дапаможа выдаліць цвіль з любой паверхні, можна нават мыць рэчы з даданнем воцату. Белая фіранка будзе па-сапраўднаму беласнежнай пасля мыцця з воцатам.

### Супраць зморшчын на вопратцы

Хітры трук для прасавання рэчаў без праса! Разбавіць воцат з вадой у суадносінах 1:3, пераліць у пульверызатар і распырскаць па паверхні адзення. Калі рэч высахне, зморшчыны знікнуць.

### Супраць плям на мэблі

Плямы на мэблі, дыванах і тканіне выдаляюцца ўмомант пры дапамозе воцату! Здаецца, ён здольны ачысціць усё. Нанясіце на тканіну або дыван сумесь воцату і солі, пратрыце пляму, высушыце і прапыласосьце.

■ Парады дачнікам

# ЧАСНОЧНЫЯ САКРЭТЫ



**Вось і надышоў час пасадкі азімага часнаку і азімай цыбулі! Найлепшы час для пасадкі азімага часнаку сёлета — перыяд з 5 да 10 кастрычніка. Галоўнае тут не перастарацца: не пасадзіць азімы часнок занадта рана або занадта позна. Наша штогадовая практыка і ўраджай гэтай культуры, які мы здымаем, гавораць пра тое, што трэба высаджваць азімы часнок бліжэй да сярэдзіны восені — гэта якраз аптымальны час.**

А ў канцы верасня трэба ўскапаць і падрыхтаваць градкі пад пасадку, каб грунт злёгку зацвярдзеў. Строгага рэгламенту па тэрмінах пасадкі азімых часнаку і цыбулі не існуе. Тут галоўнае, каб пасля пасадкі быў час зубчыкам часнаку і галоўкам цыбулі ўмацавацца і ўкараніцца да наступлення замаразкаў або падмярзання глебы. Азімую цыбулю мы заўсёды высаджваем на тыдзень пазней, а часнок, адпаведна, на тыдзень раней.

Часцяком дачнікі скардзяцца, што, нягледзячы на ўсе намаганні, азімы часнок вырастае не зусім буйны. Чаму? Таму што многія праблемы і пралікі закладваюцца яшчэ падчас пасадкі.

* Непажаданыя як вельмі ранняя, так і занадта позняя пасадкі азімага часнаку. Вопытныя дачнікі высаджваюць зубкі за 30—35 дзён да наступлення халадоў.

* Вялікія галоўкі часнаку вырастаюць з самых буйных зубкоў. Значыць, пасадачны матэрыял павінен быць адборны.

* Многія дачнікі высаджваюць азімы часнок занадта блізка ад паверхні глебы або, наадварот, вельмі заглыбляюць яго. Глыбіня пасадкі (калі лічыць ад вяршыні зубка да паверхні глебы) павінна складаць каля 5 см. Потым на зіму гэты часнок трэба яшчэ ўкрыць лістотай.

* Каб атрымаць буйныя часночыны падчас здыму ўраджаю, важна акуратна замульчыраваць яго пасадкі да наступлення замаразкаў або халадоў. Іх трэба прыкрыць рыхлым і сухім торфам або добра выспелым кампостам, але толькі тады ўкрываць, калі злёгку падмерзне глеба на градцы. Недзе ў сярэдзіне лістапада ці крыху пазней мы будзем укрываць свой азімы часнок і цыбулю з разліку 5 кг торфу на 1 м плошчы градкі. Рабіць гэта трэба своечасова!

* Здараецца, што рана пасаджаны пад зіму часнок пачынае прарастаць да пачатку ўстойлівых халадоў. Панікаваць у такім выпадку не варта! У пачатку снежня, а магчыма, і трохі раней, трэба будзе замульчыраваць пасадкі лісцем або лёгкім яловым лапнікам. У гэтай справе важна «абараніць» пункт росту кожнага зубчыка.

* Атрымаць буйныя галоўкі (пры гэтым без праполкі і рыхлення глебы) можна, калі паспрабаваць такі спосаб пасадкі. Бяром некалькі газет, кожную камячым і мочым у вадзе, потым адціскаем і акуратна раскладваем — плоска — па градцы пасадкі. Палажыўшы такім чынам 3-5 слаёў змочаных газет, нажніцамі робім адтуліны для кожнага зубчыка. Вось у іх, у гэтыя адтуліны, мы і высаджваем зубкі часнаку! Потым па газетах або паперы можна будзе прысыпаць іх апалай лістотай, а зверху яшчэ і сухім лёгкім торфам.

Для маладасведчаных дачнікаў падкажу, як адрозніць азімы часнок ад ярavога. Азімы часнок мае аднолькавыя буйныя зубкі, якія раўнамерна размеркаваны вакол сцябла. У яравога часнаку зубчыкі дробныя і размяшчаюцца ў хаатычным парадку. Калі вы пераблытаеце і пасадзіце на зіму яравы часнок, то ён проста павымярзае!

**Яўген САЛАНОВІЧ, дачнік са шматгадовым вопытам**

*ПА ГНЯЗДУ ВІДАЦЬ, ЯКАЯ ПТУШКА. (Беларуская прыказка)*

# МІРСКІ ФІЛІЯЛ ААТ «ГРОДЗЕНСКІ ЛІКЁРА-ГАРЭЛАЧНЫ ЗАВОД»





Дырэктар Мірскага філіяла ААТ «Гродзенскі лікёра-гарэлачны завод» Сяргей ТУР.



Тэхнік-хімік Алеся АСТРАВУХ у лабараторыі.




Каля ўвахода на вытворчую тэрыторыю філіяла.



Вядучы эканаміст Аляксей НАВУМОВІЧ.



Зернесушыльны комплекс на 16 тысяч тон зерня каля вёскі Сімакава (комплекс належыць Мірскаму філіялу).



На вытворчай тэрыторыі.

231444, г. п. Мір, вул. Заводская, 15. УНП 500037786

ПРАЗМЕРНАЕ ЎЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ ШКОДЗІЦЬ ЗДАРОЎЮ

## Слухай сваё

# ПАЛАЧАНЕ СПЯВАЮЦЬ ФОЛК...

Музычны гурт «Варган» выпусціў дэбютны альбом «Зялён явар, дуброва» — 18 песень і інструментальных кампазіцый, якія выконваліся на Полаччыне да знакавых гадавых свят,



у тым ліку танцы і нават абрад «Цярэшкі», а дадаткова яшчэ запіс купальскай песні ў аўтэнтычным выкананні вясковай артысткі Алімпіяды Шчарбаковай з Шастова, што пад Полацкам.

«Вясковы свет не быў глухім і шэрым захалусцем, як і людзі не былі сумнымі і заморанымі рабацягамі, бо не працай адзінай жыў чалавек. Нашы продкі ўмелі і любілі весяліцца», — сцвярджаюць «варганцы», прыводзячы ў якасці доказу інструментальную частку альбома, нібы запісаную на танцах на сапраўдных вясковых вячорках: гармонік, скрыпка, цымбалы, бубен, дуда, колавая ліра і ўласна варган, які ў Полацку, між іншым, ведалі і выкарыстоўвалі ажно з ранняга Сярэднявечча. Удзел у запісах «палітры гукаў і эмоцый» інструментальных кампазіцый узялі запрошаныя музыкі — вядомы музычны майстар, дудар і мастак Алесь Лось і цымбалістка Алеся Сівохіна.

Прэзентацыя альбома «Зялён явар, дуброва. Музыка Полачыны» адбудзецца ў Полацку 6 кастрычніка і ў Мінску — 14-га.

# ...А «ДРАЗДЫ» ЛЯЦЯЦЬ НА МАЛУЮ РАДЗІМУ

Шоумен, тэлевядучы, блогер і голас папулярнага гурта «Дразды» Віталь Карпанаў выпусціў сольны кліп на песню «Малая радзіма». І хоць сам выканаўца родам з вёскі Сівіца Валожынскага раёна, відэаролік здымаўся на задворках вуліцы Кастрычніцкай у Мінску.

«Я вясковы хлопец, які з маленства прывучаны да працы, таму вершы, можа быць, атрымаліся не самыя прыгожыя, але праўдзівыя: «Я здесь родился, да, я здесь рос, и может, в сексе я не знаю слишком много поз, но телок я доил, разбрасывал вилами по полю навоз...». У нас жа абвешчаны Год малой радзімы, дык чаму мне не прызнацца ў любові да яе?» — абвяргае Карпанаў абвінавачванні ў кан'юнктуршчыне.

Аўтэнтычны «зрэз» жыцця сельскага хлопца рабілі з дапамогай старой канапы, якую пазычылі ў знаёмых, не менш старых аўто, закінутых карпусоў аднаго сталічнага прадпрыемства, якія «ператварыліся» ў блокі машынна-трактарнай станцыі, і добраахвотную масоўку, знойдзеную сярод падпісчыкаў «Драздоў» у сацыяльных сетках. Выніковы агра-рэп можна ўбачыць на прасторах сеціва або ў эфіры музычных тэлеканалаў.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**


Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Калинковичский мясокомбинат», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная, 8 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, аг. Липов, ул. Советская, 26**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Здание комплексного приемного пункта** | 161,4 кв. м | 333/С-24121 |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,0415 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания комплексного приемного пункта

**Начальная цена с НДС 20 % – 14 544,65 бел. руб.,**
(снижена на 10 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 24.07.2018

**Аукцион состоится 11.10.2018** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 09.10.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**



**Изменения в проектной декларации**
**ООО «ДАТЧ СТАР»,**
**опубликованной в газете «Звязда» 17.05.2017 г. № 91**

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6-11 секции, II очередь строительства, секции 1-3)» (I очередь строительства, 5-6 пусковой комплекс).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются:

3 (три) нежилых помещения по принципу «свободной планировки» площадью от 48 кв. м до 85,01 кв. м: стоимость 1 кв. м от 1050 до 1100 долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося нежилого помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 19, офис 860.

Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000 УНП 191061436



Филиал «Белэксимгарант-Гродно» сообщает, что в связи с утерей **считать недействительными** страховые свидетельства серии ВА № 1459672, № 1459683.

УНП 101421509



Утерянный бланк квитанции формы 1-СУ серии СВ № 0428597 ЗАСО «КЕНТАВР» **считать недействительным.**

УНП 100985903



**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок»**

Дата и время проведения: 09.10.2018 в 11.00.
Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться с 09.00 27.09.2018 до 09.00 09.10.2018.

| № лота | Наименование | Инвентарный номер | Год выпуска, приобретения | Начальная цена с учетом дисконта 60 % (четвертые повторные торги) | Шаг аукциона, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | Фальцепрокатный м-м ОКС-8906 | 4501 | 1980 | 842,00 | 84,20 | 42,10 |
| 3 | Фальцеосадочный мех-м СТД-25 | 4336 | 1970 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 4 | Фальцепрокатный мех-м СТД-16А | 4350 | 1979 | 842,00 | 84,20 | 42,10 |
| 5 | Пневмолистогибочный м-м И2116 | 4808 | 1983 | 2 864,00 | 286,40 | 143,20 |
| 6 | Пневмолистогиб | 4989 | 1990 | 2 864,00 | 286,40 | 143,20 |
| 8 | Мех-м вальцепрокатный ОКС-9106 | 4939 | 1990 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 9 | Фальцеосадочный мех-м 5Н-475 | 4842 | - | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 10 | Фальцеосадочный мех-м СТД-25 | 4332 | 1970 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 11 | Зигмашина ИБ-2713 | 4322 | 1965 | 1 432,00 | 143,20 | 71,60 |
| 13 | Зигмашина ВМС-76В | 4321 | 1979 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 14 | Зигмашина ВМС | 4867 | 1980 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 15 | Зигмашина ВМС-76В | 4342 | 1979 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 16 | Зигмашина ИБ-2713 | 4338 | 1965 | 1 432,00 | 143,20 | 71,60 |
| 17 | Зигмашина ВМС-76В | 4339 | 1979 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 18 | Зигмашина ВМС-76В | 4809 | 1984 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 19 | Зигмашина ВМС-76В | 4925 | 1990 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 20 | Зигмашина ВМС-76 | 4320 | 1976 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 21 | Зигмашина ИБ-2713 | 4337 | 1965 | 1 432,00 | 143,20 | 71,60 |
| 22 | Зигмашина ВМС-76В | 4844 | 1988 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 23 | Механизм для вальцевания ОКС8998 | 8138 | 1982 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 24 | Фальцепрокатный мех-м СТД-16А | 4352 | 1980 | 842,00 | 84,20 | 42,10 |
| 25 | Пресс механический КБ-262 | 4848 | 1987 | 8 764,00 | 876,40 | 438,20 |
| 27 | Лебедка стационарная | 8139 | 1988 | 726,11 | 72,62 | 36,31 |
| 29 | Горизонтально-фрезер. ст. 6Р-82 | 4007 | 1975 | 1 560,00 | 156,00 | 78,00 |
| 32 | Станок продольно-строгальный 7Б112 | 54391 | 1991 | 17 271,94 | 1 727,20 | 863,60 |
| 34 | Координатно-расточной ст. 2В440А | 4451 | 1973 | 1 104,00 | 110,40 | 55,20 |
| 37 | Универсально-заточной ст-к 3В642 | 4471 | 1988 | 2 268,00 | 226,80 | 113,40 |
| 39 | Ст. горизонтально-строгальн. 73071 | 4552 | 1980 | 1 520,00 | 152,00 | 76,00 |
| 41 | Токарно-револьверный станок 1341Н | 4987 | 1974 | 1 266,00 | 126,60 | 63,30 |
| 42 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4997 | 1990 | 810,00 | 81,00 | 40,50 |
| 43 | Печь электрическая СНЗ-4 | 5090 | 1970 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 45 | Пылеотсос ЗИЛ900 | 45991 | 1984 | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 48 | Горизонтально-фрезерный ст-к 6Р82 | 4007 | 1975 | 1 560,00 | 156,00 | 78,00 |
| 49 | Продольно-шлифовальный ст. 3Д722 | 4910 | 1989 | 2 212,00 | 221,20 | 110,60 |
| 51 | Станок фрезерный 6Т82-1 | 4922 | 1987 | 2 016,00 | 201,60 | 100,80 |
| 52 | Вертикально-фрезерный ст. ВМ127М | 4952 | 1991 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 53 | Резьбонарезной механизм ВМС2А | 4980 | 1979 | 810,00 | 81,00 | 40,50 |
| 55 | Автомат отрезной 8Г662 | 4438 | 1980 | 1 848,00 | 184,80 | 92,40 |
| 56 | Токарно-револьверный станок 1П365 | 4440 | 1980 | 560,80 | 56,08 | 28,04 |
| 59 | Труборез 5Н-428 | 4231 | 1979 | 672,00 | 67,20 | 33,60 |
| 60 | Трубогиб СТД-439 | 4199 | 1979 | 1 008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 61 | Трубогиб ОКС-8943 | 4271 | 1982 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 62 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4840 | 1987 | 810,00 | 81,00 | 40,50 |
| 66 | Пресс механический КБ-245 | 4529 | 1975 | 1 371,63 | 137,17 | 68,59 |
| 67 | Пресс механический К-2124 | 4315 | 1967 | 1 334,00 | 133,40 | 66,70 |
| 68 | Пресс механический КД-2124Е | 4556 | 1983 | 1 334,00 | 133,40 | 66,70 |
| 69 | Пресс механический КД-2328Е | 4454 | 1980 | 2 100,00 | 210,00 | 105,00 |
| 71 | Пресс механический КД-2326 | 4258 | 1968 | 1 428,00 | 142,80 | 71,40 |
| 72 | Пресс механический КД-2326 | 4341 | 1979 | 1 428,00 | 142,80 | 71,40 |
| 75 | Пресс КД-2128К | 4795 | 1985 | 2 200,00 | 220,00 | 110,00 |
| 77 | Ст. токарно-винторезный 1Д95 | 4446 | 1980 | 1 496,00 | 149,60 | 74,80 |
| 78 | Горизонтально-фрезер. ст-к 6РВ2 | 4459 | 1980 | 1 560,00 | 156,00 | 78,00 |
| 79 | Ст. радиально-сверлильный 2Л534 | 4469 | 1979 | 1 360,00 | 136,00 | 68,00 |
| 80 | Вертикально-сверлильн. ст. 2Н135 | 4570 | 1972 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 81 | Обдирочно-шлифовал. ст-к 3К-634 | 4936 | 1990 | 358,00 | 35,80 | 17,90 |
| 82 | Вертикально-фрезерный ст. 6Р-11 | 4006 | 1980 | 1 800,00 | 180,00 | 90,00 |
| 83 | Вертикально-фрезерный ст. 6Р-12 | 4958 | 1975 | 1 800,00 | 180,00 | 90,00 |
| 84 | Станок круглопильный Ц6-2 | 4010 | 1979 | 596,00 | 59,60 | 29,80 |
| 85 | Станок точильно-шлифовальный 312М | 5328 | 1964 | 1 120,00 | 112,00 | 56,00 |
| 86 | Обдирочно-заточной ст-к с обор. лист | 4026 | 1980 | 317,60 | 31,76 | 15,88 |
| 87 | Сверлильный агрегат | 6240 | 2006 | 1 488,42 | 148,85 | 74,43 |
| 88 | Вертикально-сверл. ст-к 2Н-125Л | 4207 | 1974 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 89 | Трубогиб | 4221 | 1979 | 588,00 | 58,80 | 29,40 |
| 90 | Труборез 5Н-428 | 4227 | 1979 | 672,00 | 67,20 | 33,60 |
| 91 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4234 | 1973 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 92 | Вертикально-сверл. ст-к 2Н-135 | 4244 | 1970 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 93 | Станок сверлильный МН-18Н-49 | 4599 | 1991 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 94 | Резьбонарезной механизм ВМС-2 | 4232 | 1970 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 95 | Механизм трубогибочный СТД439 | 4878 | 1980 | 1 008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 96 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4884 | 1988 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 97 | Резьбонарезной механизм ВМС-2АВ | 4920 | 1990 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 99 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4240 | 1979 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 101 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4550 | 1972 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 102 | Ножницы гильотинные НА-3118 | 4328 | 1980 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 103 | Пресс механический КД-2128 | 4526 | 1973 | 2 200,00 | 220,00 | 110,00 |
| 105 | Зигмашина СТД-865 | 4801 | 1983 | 3 192,00 | 319,20 | 159,60 |
| 107 | Зигмашина ВМС-76В | 4926 | 1990 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 108 | Пресс КД-2326 | 4314 | 1996 | 2 352,00 | 235,20 | 117,60 |
| 109 | Пресс механический КД-2326Е | 4316 | 1980 | 2 352,00 | 235,20 | 117,60 |
| 110 | Фальцеосадочный мех-м СТД-25 | 4324 | 1966 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 111 | Зигмашина ВМС-76В | 4344 | 1980 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 112 | Линия для производства профнастила | 7003 | 2011 | 8000.00 | 800.00 | 400,00 |
| 113 | Ручные клещи контак. свар. TECHA7902 | 8096 | 2013 | 745,26 | 74,53 | 37,27 |
| 114 | Пресс КД 2128 | 4923 | 1990 | 2 200,00 | 220,00 | 110,00 |
| 115 | Пресс пневмомеханический | 8142 | 1978 | 3 472,44 | 347,25 | 173,63 |
| 116 | Установка для вулканита | 8143 | 1979 | 1 058,12 | 105,82 | 52,91 |
| 117 | Установка для гибки полосы | 8144 | 1992 | 1 006,56 | 100,66 | 50,33 |
| 118 | Пневмопресс | 8126 | 2002 | 837,31 | 83,74 | 41,87 |
| 119 | Станок сверлильно-настольный | 8127 | 1972 | 279,50 | 27,95 | 13,98 |
| 120 | Пресс механический КТП К-242А | 8128 | 1980 | 1 211,32 | 121,14 | 60,57 |
| 121 | Пресс-ножницы 5М-85 | 4310 | 1981 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 122 | Машина точечной сварки МТ-1618 | 5081 | 1978 | 1 680,00 | 168,00 | 84,00 |
| 123 | Машина для вальцовки ОКС 8998 | 4365 | 1982 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 125 | Вертикал-сверлильный ст-к 2Н-135 | 4463 | 1980 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 126 | Вертикально-сверлильный станок | 4531 | 1972 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 127 | Станок отрезной 8Г240КЛ.Н | 4928 | 1997 | 278,00 | 27,80 | 13,90 |
| 128 | Пресс механический КД-2124К2.1Т | 4950 | 1991 | 1 334,00 | 133,40 | 66,70 |
| 129 | Станок для рубки уголка и круга | 8137 | 1988 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 130 | Настольно-сверлильный станок | 4001 | | 248,00 | 24,80 | 12,40 |
| 131 | Обдирочный станок 3К633 | 4908 | | 420,00 | 42,00 | 21,00 |
| 132 | Кран конс. пов. эл. г/по.0,5ТС | 6045 | 1980 | 1 000,00 | 100,00 | 50,00 |
| 133 | Станок отрезной ножовочный 872М | 4009 | 1971 | 350,00 | 35,00 | 17,50 |
| 134 | кран подвесной г/п 5 тн | 27 | 1976 | 900,00 | 90,00 | 45,00 |
| 135 | набор мягкой мебели «Рикардо 1» | 6518 | | 644,40 | 64,44 | 32,22 |

Продавец и организатор торгов: ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок», тел. +375163414964.
Место проведения: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46, здание администрации.
Место нахождения предмета торгов: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46.
Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок, заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет предприятия, с отметкой банка Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение десяти рабочих дней со дня их проведения. Кроме того, представляются следующие документы:
юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора) и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;
индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;
представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность.
При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.
Ознакомиться с предметами торгов можно по месту нахождения, предварительно согласовав дату и время с представителем продавца по тел. +375298091058.
По результатам торгов организатором торгов составляется протокол, подписываемый всеми участниками аукциона.
С победителем торгов продавцом в срок не позднее пяти рабочих дней от даты подписания протокола о результатах торгов заключается договор купли-продажи. Приобретенный предмет торгов оплачивается участником, выигравшим торги не позднее 3 рабочих дней от даты заключения договора купли-продажи.
В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть подан этому участнику по цене, превышающей начальную, на 5 %

■ Свет вытокаў паэта

# БО ТАМ ПАКІНУЎ ЁН ДУШЫ ЧАСЦІНКУ...

## У сядзібе Завоссе рыхтуюцца адзначыць 220-я ўгодкі Адама Міцкевіча

**Завоссе Баранавіцкага раёна, як цяпер прынята гаварыць, малая радзіма велічыні сусветнай літаратуры Адама Міцкевіча. Той, пра якога Пушкін з гонарам гаварыў: «Ён паміж намі жыў», вярнуўся ў родны край, куды заўсёды імкнулася яго душа, праз 200 гадоў. Вярнуўся ва ўдзячнай памяці нашчадкаў. Менавіта да 200-годдзя з дня нараджэння вялікага сына радзіма аддала належнае яго асобе. У 1998 годзе была аднаўлена і ўрачыста адкрыта сядзіба, дзе Адам з'явіўся на свет.**



### Адроджаны маёнтак

Дарэчы, гэта быў першы маштабны культурна-гістарычны праект Брэсцкай вобласці па ўзнаўленні былых маёнткаў. Пазней адраджэнне перажылі сядзібы Касцюшкі, Нямцэвічаў, Ружанскі ды Косаўскія палацы. А тады, роўна 20 гадоў таму, у Завоссі адкрылі музей. Яго стварылі на пустым месцы па малюнках Эдварда Паўловіча і Напалеона Орды. Праўда, падчас раскопак знайшлі частку фундаментаў, якія даволі добра захаваліся. Таму сядзібны дом і іншыя пабудовы стаяць на тых самых падмурках, дзе яны былі два стагоддзі таму.

Музей-сядзібу адкрылі для наведвальнікаў 8 верасня 1998 года. Яна ўяўляе сабой шляхецкі двор другой паловы XVIII стагоддзя. Дахі драўляных будынкаў пакрылі, як і тады, чаротам. У цэнтры — аднапавярховы дом з ганкам, насупраць яго свіран, далей абора, гумно, студня-журавель, лазня. Двор абнесілі агароджай, бо ў тыя часы казалі: «Шляхціч у сваёй загродзе роўны ваяводзе». Сядзіба размешчана паміж палёў побач з гарой Жарнова, якую Міцкевіч згадвае ў сваіх творах. А да 1994 года тут зусім нічога не было, чыстае поле. Памяць захавала толькі зямля з ацалелымі падмуркамі. А яшчэ засталася старая ліпа. Паводле ацэнак спецыялістаў, ёй не менш за 200 гадоў. Яе пакалечыў удар маланкі, але ад старога камля адрасло новае дрэўца. Так што ліпа, якая адна, відаць, з усяго цяперашняга маёнтка, помніць Адама, здаецца, і адыходзіць у нябыт не збіраецца. Гэтае дрэва абавязкова паказваюць экскурсантам. Цікава, што побач са старой ліпай вырасці клён з бярозай, якія абняліся камлямі. Такія вось дзівосы прыроды параджае тутэйшая зямля. А яшчэ цішыня, спакой, нейкая ўнутраная раўнавага, якая апаноўвае праз некалькі хвілін знаходжання ў фальварку, робіць яго асабліва прывабным. Сюды хочацца зноў вярнуцца, не дарэмна ж паэт у гэтых краях пісаў: «Калі ж дазволіш, Божа, мне ў той край вярнуцца, з выгнання горкага, каб дома апынуцца...»

### Дом-музей

**Загадчык гэтай музейнай установы, якая з'яўляецца філіялам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Віктар ДМУХОЎСКІ** запрашае ў дом-музей. З ганку трапляем у сенцы. Яны дзеляць, як звычайна ў тых дамах, сядзібу на дзве паловы. Адна палова — жылая, панская, другая — гаспадарчая для чэлядзі. Дзверы направа вядуць у вялікі пакой — сталовую-гасцёўню, далей яшчэ адна гасцёўня і спальня. За ёй ёсць невялікі пакой, дзе, паводле падання, і нарадзіўся будучы паэт. Цяпер у тым пакоі стаіць пісьмовы стол з крэслам XVIII стагоддзя, а сцяну ў гасцёўні ўпрыгожвае вялікі дыван з перакрыжаванымі шаблямі. Інтэр'ер стварылі, кіруючыся апісаннямі з паэмы «Пан Тадэвуш». Як вядома, у многім гэты твор аўтар пісаў са свайго жыцця.

Цікавы для наведвальнікаў і двухпавярховы свіран. На першым паверсе месцяцца гаспадарчыя прылады і прыстасаванні: бочкі для квашання агуркоў і капусты, кубельцы для сала, засекі для збожжа. На версе — летняя хата, пакойчык Адама, дзе ён начаваў летам, калі прыязджаў сюды на вакацыі ды сустракаўся з любай Марыляй.

У музеі вам абавязкова раскажуць, што менавіта тут напярэдадні Калядаў 1798 года жонка адваката Мікалая Міцкевіча Барбара з роду Маеўскіх нарадзіла сына. Прозвішча Міцкевіч у тутэйшых мясцінах даволі распаўсюджанае. Паходжанне паэта часцей за ўсё вызначаюць так: з апалячанай беларускай шляхты. Сям'я была небагатая, жыла з бацькавых заробкаў. А калі галава сям'і памёр, удава з пяццю дзецьмі пазнала і нястачу. Менавіта маці была першай настаўніцай Адама, яна вучыла сына пісаць і чытаць, прывівала цікавасць да музыкі і паэзіі. А яшчэ яго вучылі нянькі, тутэйшыя жыхаркі. Ад іх ды старога слугі Аблажэя чуў будучы паэт народныя песні, казкі, паданні. З дзіцячых гадоў ён ведаў легенду пра горад, які паглынула возера Свіцязь. Таму ёсць нагода сцвярджаць, што менавіта гэтая зямля зрабіла з яго паэта, бо тут ён спасціг музыку гуку. Варта пачытаць балады «Свіцязянка», «Свіцязь», «Рыбка». Незвычайнае возера славілася не толькі сваёй крыштальнай чысцінёй, але і гаючай сілай, яно параджала легенды. У яго ваколіцах кожны станавіўся крыху паэтам.

### Найлепшыя гады і вечны сум

А ў Туганавічах, зусім недалёка ад Свіцязі, жыла прыгажуня Марыля Верашчака, першае і, магчыма, адзінае светлае ўзнёсла-рамантычнае пачуццё паэта. Каханне, якому, на жаль, не суджана было збыцца. Калі яны пазнаёміліся, Марыля была заручаная з графам Путкамерам. Перажытыя імгненні шчасця ператварыліся ў вечны сум. У большасці твораў паэта, напісаных цягам усяго жыцця, можна знайсці водгукі таго кахання. Можа яшчэ і таму ён усёй душой імкнуўся ў родныя мясціны падчас свайго доўгага выгнання.

Ёсць меркаванне, што менавіта ў Завоссі Адам Міцкевіч пражыў свае найлепшыя гады. Усё яго далейшае жыццё шчаслівым бадай што не назавеш. Забягаючы крыху наперад, працытую Герцэна. У «Былым і думах» чытаем: «Мяне ўласна цікавіла адна асоба — Адам Міцкевіч; я яго ніколі раней не бачыў. Ён стаяў ля каміна абапёршыся локцем на мармуровую дошку. Хто бачыў яго партрэт, прыкладзены да французскага выдання і зняты, здаецца, з медальёна Давіда д'Анжэ, той мог адразу пазнаць яго, нягледзячы на вялікія змены, унесеныя гадамі. Шмат думак і пакутаў адлюстраваліся ў яго твары, хутчэй літоўскім, чым польскім. Агульная выява яго фігуры, галавы з пышнымі сівымі валасамі і стомленым поглядам выражала перажытае няшчасце, знаёмства з унутраным болем, экзальтацыю нягод, гэта быў пластычны вобраз лёсаў Польшчы».



### Выгнанне

У 1815 годзе Адам стаў студэнтам Віленскага ўніверсітэта. Там ён сустрэў сяброў-аднадумцаў, з імі марыў аб служэнні радзіме. У 1817 годзе разам з таварышамі яны стварылі тайнае маладзёжнае «таварыства філаматаў», што азначала «аматараў навукі». З часам суполка перайшла ад сяброўскіх сходаў, дзе чыталіся вершы, апавяданні, вяліся спрэчкі да смелых планаў па падрыхтоўцы моладзі да патрыятычнай барацьбы. Ужо ў студэнцкія гады яго справай душы становіцца паэзія, у 1822 годзе выйшаў першы паэтычны зборнік. А ў 1823 годзе на той час малады ковенскі настаўнік становіцца паэтам агульнанацыянальнага значэння. Выходзяць у свет паэмы «Дзяды», «Гражына». Але тут здарылася няшчасце. Улады выйшлі на след нелегальных гурткоў. Паэт быў арыштаваны і змешчаны ў келлю віленскага манастыра, які ператварылі ў турму. Тады яго таварышы атрымалі суровыя прысуды: крэпасць, ссылка, салдатчына. Міцкевіча сябры старанна выгароджвалі, таму яго пакаранне было дастаткова мяккім: высылка з Літвы ва «ўнутраныя» губерні Расіі. У кастрычніку 1824 года ён пакінуў родны край, як аказалася, назаўсёды.

Але рускае грамадства прыняло выгнанніка надзвычай прыязна. У Маскве ў салоне княгіні Валконскай наш зямляк сышоўся з вядомымі літаратарамі, а ў 1826 годзе адбылася яго сустрэча з Пушкіным. Паэты сталі сябрамі, разам бывалі на літаратурных вечарынах, перакладалі адзін аднаго.

Але і рускі перыяд жыцця паэта быў нядоўгім. Над сумным рамантыкам зноў збіраліся хмары, і ў 1829 годзе ён выехаў за мяжу, каб ніколі ўжо не вярнуцца на радзіму. Большая частка еўрапейскага перыяду жыцця прайшла ў Парыжы, там ён і быў пахаваны. Потым рэшткі перавезлі ў Кракаў.

### Радзіма ў творах Міцкевіча

Міцкевіч заўсёды называў сваёй радзімай «Літву» і пра беларускую мову выказваўся з нязменнай павагай. А польскую паэзію ён зрабіў вядомай усяму свету, вывеў яе з палацаў і салонаў і загаварыў простымі пранікнёнымі словамі, якія жылі нават у сялянскай хаце. Ён пішa пра чалавечыя справы і пачуцці, пра людзей, што жывуць побач.

А паэма «Пан Тадэвуш»?! Цудоўны гімн цяперашнім Навагрудчыне і Баранавіччыне, лясам і палям, працавітым людзям. У паэме выкарыстаны мясцовыя казкі і легенды. Тут шмат беларускіх слоў (покуць, вырай, рунь), ёсць і мясцовыя дыялекты, якія да гэтай пары жывуць у краі Міцкевіча. Ну, напрыклад, выраз «ачамярэў ты мне» сустракаецца ў рэпліках герояў «Пана Тадэвуша». Так гавораць і ў навакольных вёсках пра таго, хто надта надакучыў. Супрацоўніца музея Таццяна Калоша кажа, што ў творах паэта вялікае мноства мясцовых слоў і выразаў.

### Пад вечным небам паэта

У суботу, 29 верасня, адбудзецца вялікая імпрэза з нагоды 220-й гадавіны з дня нараджэння Адама Міцкевіча. Са **старшынёй Сталовіцкага сельскага Савета Мікалаем ГРЫБАВЫМ** заязджаем у сядзібу, калі там поўным ходам ідуць работы па добраўпарадкаванні.

— Тут заўсёды чысціня і парадак, — расказвае Мікалай Уладзіміравіч, — але перад прыездам гасцей хочацца зрабіць яшчэ лепш. Баранавіцкі лясгас праводзіць замену агароджы, за 20 гадоў яна папсавалася, жыллёва-камунальная служба дала тэхніку і людзей, каб скасіць траву, бо ў вялікія плошчы, ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» таксама дапамагае ў добраўпарадкаванні.

Вялікая работа тут была праведзена ў 2015 годзе, напярэдадні мерапрыемства па лініі ААН, — працягвае кіраўнік мясцовай улады. — І тады і цяпер штаб па правядзенні работ узначальваў старшыня райвыканкама Васіль Хвацік. Другога падобнага аб'екта няма ў раёне, таму можна сказаць, што мы ўсім раёнам любім гэты музей і праяўляем адпаведны клопат. Думаю, што госці, якія прыедуць сюды ў суботу, застануцца задаволеныя.

**Загадчыца навукова-асветніцкага аддзела Дзяржаўнага музея беларускай літаратуры Эліна СВІРЫДОВІЧ** расказала, што літаратурна-мастацкае свята, якое рыхтуецца ў музеі-сядзібе Міцкевічаў «Завоссе», назвалі «Адамаў шлях пад вечным небам»:

— Паэт напісаў некалі: «Як Богу — божы свет, так мой уласны дом на радзіме быў шырокім светам усіх маіх вытокаў...» і яшчэ: «Вялікае шчасце было нарадзіцца на гэтай зямлі» — так ён казаў пра сваё Завоссе, месца вядомае ў Беларусі і за яе межамі. Імя славутага земляка, слава і творчасць класіка сусветнай літаратуры яднае культурныя прасторы краін. Завоссе стала месцам сумеснай памяці суседніх з намі народаў, якія таксама лічаць Міцкевіча сваім паэтам. Адам Міцкевіч не дзеліць нас, а аб'ядноўвае, пашырае сяброўскае паразуменне народаў у культурным дыялогу.

У праграме свята значыцца канцэрт «Ёсць у мяне зямля, край светлых мрояў», экскурсіі па сядзібе, выстаўка «Дзяды» Адама Міцкевіча: гісторыя душы», літаратурна-грамадская акцыя «Чытаем класіка разам», «Горад майстроў», «Бібліятэчны марафон», займальныя квэсты, гульні, заняткі на дзіцячай інтэрактыўнай пляцоўцы.

Ёсць магчымасць паехаць на свята з Мінска. Ад'езд у 8.30 ад Траецкага прадмесця каля Вострава слёз.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Баранавіцкі раён.*

**Фота аўтара і з архіва Сталовіцкага сельскага Савета**

■

■ На экранах

# СУПЯРЭЧЛІВЫ «БЕРГМАН»

## У Мінску паказваецца дакументальны фільм пра шведскага генія

**Мы жывём у час выдатнай кінападзеі — рэтраспектывы аднаго з найвялікшых, найвядомейшых і найпулывовейшых рэжысёраў у гісторыі кінематографа Інгмара Бергмана. Дваццаць адрэстаўраваных фільмаў паказваюцца на вялікім экране ў мінскія выхадныя.**



Гэта называецца «Уік-энды з Бергманам» і арганізуецца Цэнтрам аўдыёвізуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт Карпарэйшн» пры падтрымцы пасольства Швецыі ў Беларусі і Шведскага інстытута. А паралельна заплыву ў кіно геніяльнага рэжысёра на экранах сталічных кінатэатраў можна ўбачыць дакументальны фільм, ён так і называецца — «Бергман», які то цвяроза, то сентыментальна распавядае, наколькі супярэчлівай персонай Інгмар Бергман быў.

У 2018 годзе мы святкуем стагоддзе Інгмара Бергмана, а пра яго, здаецца, не сказаў толькі лянівы. Заўважана, што пасля выхаду чарговага «прысвячэння» — Элвісу Прэслі, Пабла Пікаса або, нарэшце, знакамітаму рэжысёру — узнікае пытанне, што новага можна было сказаць, калі ўжо патрачана так многа слоў. І кожны раз аказваецца, што дастаткова слоў у такіх выпадках не бывае. Не кажучы ўжо пра актуалізацыю імені, вяртанне да таго, што змяніла свет мастацтва, у гэтым выпадку мастацтва кіно, і тым факце, што дакументальны фільм — сам па сабе самастойны твор.

Дакументальную работу Яне Магнусан, якая да гэтага таксама зрабіла «Уварванне да Бергмана» для шведскага нацыянальнага тэлебачання, крытык Variety назваў «адным з самых сумленных партрэтаў кінамастака». І прэм'ера гэтага партрэта адбылася на Канскім кінафестывалі.

Сумленнасць карціну сапраўды вылучае. Без лішняга захаплення Яне Магнусан паказала, што, будучы геніяльным рэжысёрам, Інгмар Бергман быў вельмі супярэчлівай асобай. Расказы пра поспехі яго фільмаў і тэатральных пастановак суправаджаюцца гісторыямі аб тым, што класік, напрыклад, падтрымліваў нацыстаў і суперажываў Германіі падчас Другой сусветнай вайны. Пра тое, што Бергман быў вельмі бязладным бацькам — ён, дарэчы, гэта прызнаваў — і непастаянным у любоўных стасунках. Што ён выкарыстаў свой аўтарытэт, каб вельмі знішчыць віднага і шматабяцальнага акцёра ў Каралеўскім драматычным тэатры, у каментарыях гэта растлумачылі канкурэнцыяй.

Дакументальная карціна бярэ за пункт адліку вельмі насычаны для рэжысёра 1957 год. У 1957-м у Бергмана, які пакутаваў ад язвы страўніка, выйшла некалькі фільмаў, сярод якіх «Сёмая пячатка» і «Сунічная паляна», было пастаўлена некалькі спектакляў, адбылося мноства змен у асабістым жыцці. Гэты год дэманструе фенаменальную працаздольнасць Бергмана, паказвае кірунак яго інтарэсаў, канчатковa і беспаваротна робіць яго знакамітым аўтарам.

Карціна змяшчае ў сабе сцэны з фільмаў, архіўныя планы са здымачных пляцовак ці тэатральнай сцэны, інтэрв'ю Бергмана для тэлебачання і яго адказы на пытанні дакументалістаў, каментарыі яго калег, вучняў, сваякоў і каханых. На экране з'яўляюцца брат Інгмара Бергмана, адна з яго жанчын, той самы акцёр, што пацярпеў ад гневу вялікага рэжысёра.

Якімі б ні выглядалі супярэчнасці асобы, нават з доляй сантыментаў фільм дае магчымасць гледачу самому вырашаць вечную дылему — як ставіцца да таго, хто стварае вялікае кіно, але падтрымлівае нацыстаў. Бергман, акрамя таго, што аказваецца выкрытым, фігуруе ў кранальных і пацешных сцэнах. Ён смешыцца і выклікае простую чалавечую прыязнасць. Ён арганічны ў сваёй стыхіі — на здымачнай пляцоўцы, ён жартуе і засяроджана ўглядаецца ў месца дзеяння, ён далікатна і пакорліва адказвае на пытанні журналіста.

Нарэшце, яго кіно. «Сёмая пячатка», «Персона», «З жыцця марыянетак», «Фані і Аляксандр», «Восеньская саната» — у кожным з фільмаў рэжысёр «стварае ўласны свет — свет, дзе ён распавядае, што значыць быць такім чалавекам, як Інгмар Бергман». Дакументальная карціна вельмі прыгожа паказвае, што дзяцінства Бергмана і яго сям'я, яго стасункі з жанчынамі, яго страхі, некантралюемыя пачуцці і ўспаміны ўвасобіліся ў кожнай карціне, што кожная работа — насамрэч пра самога Бергмана. І ў гэтым, магчыма, хаваецца адзін са шматлікіх, але сакрэт.

Магчыма, няма зараз больш важнай справы, чым паглыбіцца ў «Бергмана». Фільм паказваецца ў кінатэатрах «Піянер», Falcon Club Буцік Кіно і Silver Screen Galileo.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.04 | 18.58 | 11.54 |
| Віцебск — | 6.54 | 18.46 | 11.52 |
| Магілёў — | 6.54 | 18.46 | 11.52 |
| Гомель — | 6.50 | 18.43 | 11.53 |
| Гродна — | 7.19 | 19.12 | 11.53 |
| Брэст — | 7.19 | 19.13 | 11.54 |

### Месяц

*Поўня 25 верасня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

*Пр. УЗВІЖАННЕ КРЫЖА ГАСПОДНЯГА.*
*Івана.*
*К. Вінцэнта, Дамяна, Космы.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Дзяўчатам на заметку.**
**Хто рана кладзецца спаць, той позна выходзіць замуж.**

— Сёма, давай вып'ем.
— Але цяпер шэсць гадзін раніцы!

— Я цябе, што, пытаюся колькі часу?..

**Начальнік паехаў у адпачынак, а такое адчуванне, што мы ўсім калектывам месяц па яго пуцёўцы адпачывалі.**

З 70-гадовым юбілеем віншуем нашу родную і любімую жонку, матулю, бабулю **АЎДЗЕЙ Ганну Мікалаеўну** з вёскі Заастравечча Клецкага раёна Мінскай вобласці. У гэта цудоўнае свята жадаем шчодра здароўя, дабрабыту, доўгіх гадоў жыцця! Душой ніколі не старэй, няхай жыццё праходзіць без клапот і смутку. Жадаем, каб кожны дзень свяціла сонца, а слёзы з'яўляліся толькі ад радасці. Няхай з табою дзеляць радасць і перажыванні родныя, дзеці і блізкія сябры, дарога жыцця не ведае хвацкіх паваротаў, а лёс заўжды прыносіць прыемныя падзеі.

Вёснаў пралецела хай нямала,
Скроні пабялелі, і маршчынкі праляглі.
З юбілеем, жонка, дарагая мама,
Найраднейшы чалавек на ўсёй зямлі.
Хай адыдуць прэч хваробы і трывогі,
Просім Бога, каб жыццё тваё бярог,
Каб заўсёды нас прыводзілі дарогі
На знаёмы, родны твой парог.

**Муж, дзеці і ўнукі.**



Даты | Падзеі | Людзі

**27 ВЕРАСНЯ**

**У краіне**

**1533** год — нарадзіўся (Румынія) Стафан Баторый, дзяржаўны дзеяч, палкаводзец, вялікі князь літоўскі, кароль польскі. У 1576 годзе абвешчаны вялікім князем літоўскім. У 1579—1582-м узначальваў войскі Рэчы Паспалітай у Лівонскай вайне 1558—1583 гадоў. Імкнуўся да ўмацавання каралеўскай улады, разам з тым падтрымліваў шляхту. Сваім прывілеем ад 1 красавіка 1579 года пераўтварыў Віленскі езуіцкі калегіум у акадэмію (пазней — Віленскі ўніверсітэт), даў дазвол на заснаванне езуіцкага калегіума ў Полацку, ініцыяваў стварэнне езуіцкага калегіума ў Гродне, дзе знаходзілася адна з яго каралеўскіх рэзідэнцый. Памёр у 1586 годзе.

**1903** год — нарадзілася (горад Бабруйск) Вера Захараўна Харужая, вядомы дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Герой Савецкага Саюза. Была адным з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля ў Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1920 годзе ўдзельнічала ў барацьбе з бандамі Булак-Балаховіча, працавала ў Мазырскім і Бабруйскім павятовых камітэтах камсамола. З 1924-га была на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Выступала ў нелегальным друку, на мітынгах, арганізоўвала падпольныя сходы і нарады моладзі, стварала падпольныя камсамольскія арганізацыі. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова арыштоўвалася польскімі ўладамі.



У 1928 годзе асуджана да 8 гадоў зняволення. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе была на партыйнай рабоце ў Целяханах, Пінску. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны партызанка атрада В. З. Каржа. У 1942 годзе накіравана ў варожы тыл. Стварыла і ўзначаліла групу Віцебская патрыятычнага падполля, перадавала камандаванню Чырвонай Арміі і партызанам каштоўныя звесткі пра ворага. У лістападзе 1942 года арыштавана і закатавана фашыстамі.

**1918** год — нарадзіўся (вёска Сарагі Слуцкага раёна) Канстанцін Васілевіч Герчык, генерал-палкоўнік, кандыдат ваенных навук, прафесар. У Чырвонай Арміі — з 1938 года. У Вялікую Айчынную вайну на Заходнім, Бранскім, Цэнтральным, 1-м і 4-м Украінскіх франтах: начальнік штаба палка, брыгады. Удзельнік баёў пад Бабруйскам, Бранскам, Варонежам, Курскам, Львовам, Кракавам, Прагай. З 1950 года — у ракетных войсках стратэгічнага прызначэння, у тым ліку начальнік штаба касмадрома, начальнік касмадрома Байканур. Аўтар кніг «Байканур у пачатку шляху», «Прарыў у космас», «Незабыўны Байканур», «Погляд скрозь гады». Памёр у 2001 годзе.

**У свеце**

**1540** год — дзень заснавання ордэна езуітаў. Езуіты — члены найбольш уплывовага ў каталіцкай царкве манаскага ордэна «Таварыства Ісуса», заснаванага ў 1534 годзе ў Парыжы Ігнатам Лаёлам для абароны інтарэсаў папства, барацьбы з ерасямі і місіянерскай дзейнасці. Ордэн быў зацверджаны папам Паўлам III 27 верасня 1540 года і пабудаваны на прынцыпах адзінаначалля і строгага цэнтралізму, жалезнай дысцыпліны і безумоўнага падпарадкавання волі старэйшага.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3451.
Нумар падпісаны ў 19.30 26 верасня 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12